ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чацвер 27 студзеня 1938 г., № 5 (347)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

РАШЭННЕ, ЯКОЕ ЎЗБРОИВАЕ МАСЫ

Пастанова студзеньскага Пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ўстраненню гэтых недахопаў»—выключна яркі дакумент, які гаворыць аб сталінскіх клопатах пра лёс члена партыі, аб сталінскай рэволюцыйнай пільнасці.

Гэта пастанова мае велізарнейшае значэнне не толькі для партыі, але і для ўсёй нашай краіны. Гэта бліскучы дакумент, які гаворыць пра клопаты нашай партыі, вялікага Сталіна аб чалавэку.

Наша партыя правяла велізарнейшую работу па выкарчоўванню трацкісцка-бухарынскіх ды іншых варожых гнёздаў. Народ наш лікуе з повацу праведзенай гіганцкай работы па ліквідацыі асноўных ачагоў махляроў чорных спраў — трацкісцка-бухарынскай, нацыянал-фашысцкай ды іншай погані. Але ў працэсе гэтай надзвычай важнай і жыццёва неабходнай работы радам партарганізацый і іх кіраўнікоў дапушчаны сур'ёзнейшыя памылкі. Аб гэтых памылках з усёй сталінскай праматой і гаворыцца ў пастанове Пленума ЦК ВКП(б). Гэта пастанова ўзбройвае нашу партыю новай вастрэйшай зброяй у барацьбе за поўную ліквідацыю ўсялякіх ворагаў народа, пад якой-бы маскай яны ні хаваліся.

Сутнасць памылак партыйных арганізацый і іх кіраўнікоў заключаецца ў тым, што «наперакор неаднаразовым указанням і папярэджанням ЦК ВКП(б), партыйныя арганізацыі ў многіх выпадках падыходзяць зусім няправільна і злачынна-лёгкадумна да выключэння комуністаў з партыі». (З пастановы Пленума ЦК ВКП(б).

Партыйным арганізацыям і іх кіраўнікам трэба памятаць словы таварыша Сталіна, што **«для радавых членаў партыі прабыванне ў партыі ці выключэнне з партыі — гэта пытанне жыцця і смерці».**

Для партыйных арганізацый і іх кіраўнікоў пры вырашэнні лёсу члена партыі важна ўстанавіць, наколькі той ці іншы член партыі з'яўляецца комуністам, ці адданы ён справе партыі Леніна—Сталіна, справе комунізма. У большэвіка ніколі не дрогне рука, калі справа будзе ісці аб трацкісцка-бухарынскіх, нацыянал-фашысцкіх ды іншых ворагах народа. Але пры вырашэнні падобных пытанняў трэба ўмець адрозніваць прыяцеляў ад ворагаў. Практыка перастрахоўкі пры вырашэнні падобнага роду пытанняў, якая мела месца ў радзе партыйных арганізацый, чужая большэвізму.

У пастанове Пленума сказана:

«Пара зразумець, што сутнасць большэвіцкай пільнасці заключаецца ў тым, каб умець выкрываць ворага, якім-бы хітрым і зваротлівым ён ні быў, у якую-б тогу ён ні апранаўся, а не ў тым, каб без разбору, альбо «на ўсякі выпадак» выключаць дзесяткамі і сотнямі з партыі ўсіх, хто трапіць пад руку.

Пара зразумець, што большэвіцкая пільнасць не толькі не выключае, а, наадварот, прадпалагае ўменне праяўляць максімум асцярожнасці і таварыскіх клопатаў пры вырашэнні пытанняў аб выключэнні з партыі альбо аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі».

Фальшывая пільнасць толькі на-руку ворагам народа, бо яна адводзіць удар ад сапраўдных трацкісцка-бухарынскіх, нацыянал-фашысцкіх агентаў. Фашысцкім вырадкам дапамагаюць іх прамыя родзічы — кар'ерысты-комуністы, у якіх часамі ў самых «рыльца ў пуху». Для таго, каб застрахаваць сябе ад мажлівых абвінавачванняў у недахопе пільнасці кар'ерысты-комуністы пачынаюць пісаць ва ўсе канцы заявы з мэтай кампраметацыі адданых справе партыі Леніна—Сталіна членаў партыі.

Пленум Цэнтральнага Камітэта патрабуе ад нас «выкрыць і да канца **знішчыць замаскіраванага ворага,** які прабраўся ў нашы рады і стараецца фальшывымі крыкамі аб пільнасці стаіць сваю варожасць і захаваць сябе ў партыі, каб праводзіць у ёй сваю гнусную здрадніцкую работу».

Крыкуны, кар'ерысты-комуністы ёсць і сярод літаратараў і мастакоў, якія замест барацьбы супроць ворагаў народа на фронце мастацтва «каламуцяць ваду» падачай рознага роду заяў на адданых справе комунізма членаў партыі з тым, каб фальшывымі крыкамі аб пільнасці стаіць сваю варожасць і захаваць сябе ў партыі з мэтай праводзіць здрадніцкую дзейнасць. Партарганізацыі ССПБ, Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, комуністы кіно ды іншых мастацкіх устаноў павінны вывесці «на чыстую ваду» гэтых крыкуноў.

У практыцы работы партарганізацыі ССПБ меліся выпадкі, калі людзі, зараз выкрытыя як ворагі народа, ішлі на ўсё, каб скампраметаваць паасобных членаў партыі, дабіваючыся ў адносінах некаторых членаў партыі пастаноўкі пытання аб іх выключэнні. Цяпер становіцца зусім ясным, што гэта быў адзін з прыёмаў апалелых фашысцкіх сабак захаваць сваю скуру.

Партарганізацыя ССПБ не навучылася метка біць па ворагу. Патрэбна ўдзесяцерыць рэволюцыйную пільнасць з тым, каб выкрыць і выкарчаваць рэшткі ворагаў народа, якія шкодзяць стварэнню соцыялістычнай літаратуры.

Глыбока вывучаць і па-большэвіцку выконваць рашэнні Пленума ЦК ВКП(б)—зараз асноўная задача комуністаў, працуючых на фронце літаратуры і мастацтва. Пастанова «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі» дапаможа разабрацца ў радзе складанейшых пытанняў барацьбы з ворагам. У якую-б тогу ні апранаўся, якбы ні маскіраваўся вораг, ён будзе разгромлен і выкарчаван да канца.

Совецкія літаратары могуць і павінны сваім мастацкім словам дапамагчы партыі ў справе выяўлення і выкрыцця крыкуноў, комуністаў-кар'ерыстаў, якія шкодзяць у барацьбе супроць усялякіх ворагаў народа. Комуністы, партыйныя і непартыйныя большэвікі, якія працуюць на фронце мастацтва, павінны павесці рашучую барацьбу па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў літаратуры, у тэатрах, кіно, музыцы, у выяўленчым мастацтве,—на гэтых адказнейшых участках ідэалагічнага фронта.

«Пленум ЦК ВКП(б) патрабуе ад усіх партыйных арганізацый і іх кіраўнікоў усямернага павышэння большэвіцкай пільнасці партыйных мас, выкрыцця і выкарчоўвання да канца ўсіх вольных і нявольных ворагаў партыі».

Пастанова Пленума ЦК ВКП(б) абавязвае большэвіцкі друк працаваць значна лепш з тым, каб дапамагчы нашай партыі ў справе поўнага разгрому і выкарчавання ворагаў народа, ворагаў соцыялізма.

«Велічэзны задачы друку, якія вынікаюць з пастановы Пленума Цэнтральнага Камітэта партыі. Кожны орган друку, які змясціў дыскрэдытуючыя члена партыі матэрыялы, абавязан друкаваць пастанову адпаведных партыйных органаў, калі гэтыя абвінавачванні не пацвердзіліся. Адсюль ясна, што адказнасць нашых газет за змяшчаемы матэрыял нязмерна ўзрастае.

Толькі чалавек, які не мае нічога агульнага з большэвізмам, толькі палітычны абываталь мог-бы зрабіць адсюль вывад, што гэтым самым з друку знімаецца абавязак выкрываць ворагаў па-большэвіцку крытыкаваць непрыгодных работнікаў. Яшчэ вастрэй, чым раней ён павінен выкрываць ворагаў, але ворагаў сапраўдных, а не мнімых» («Праўда»).

Ведучы бязлітасную барацьбу супроць панікёраў, перастрахоўшчыкаў, знішчаючы ворагаў народа, трацкісцка-бухарынскую банду, нацыянал-фашыстаў, шпіёнаў, шкоднікаў ды іншую нечысць, ведучы барацьбу за ліквідацыю шкодніцтва на фронце мастацтва, за ліквідацыю ўсякіх варожых тэорый на фронце мастацтва рэпадываў фармалізма ды інш.,—згуртуемся яшчэ шчыльней вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта, вакол вялікага сцяга Леніна—Сталіна!

ВЫСТАЎКА „ШЛЯХ ЛЕНІНА“

Да 14 гадавіны з дня смерці В. І. Леніна ў менскай Дзяржаўнай бібліятэцы, у вялікай чытальнай зале, адкрылася выстаўка «Шлях Леніна», прысвечаная памяці геніяльнага правадыра, арганізатара Кастрычніцкай рэволюцыі. Выстаўка складаецца з 10 вялікіх вітрын, у якіх выстаўлены кнігі, брашуры, партрэты і фотаздымкі, адлюстроўваючыя розныя перыяды жыцця В. І. Леніна. Выстаўка складзена ўмела, з вялікім густам.

Выстаўкі кніг, брашур і фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць жыццёвы шлях В. І. Леніна, арганізаваны таксама пры бібліятэцы імя Пушкіна, у клубах работнікаў дзяржгандлю і харчавікоў.

Мастакі-самавучкі рыхтуюцца да Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі

Мастакі-самавучкі БССР уключыліся ў падрыхтоўку да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Кіраўніцтва Дома народнай творчасці паслала мастакам спецыяльнае пісьмо са зваротам — даць для выстаўкі свае лепшыя работы. Адначасова кіраўніцтва Дома народнай творчасці распрацавала тэматычны план для мастакоў-самавучак, які ўключае звыш 80 розных тэм.

Пятро Глебка

ПОМНІК

Пагасаюць агні над сталіцай,
Засынаюць кварталы Масквы...
Толькі нам, падарожным, не спіцца,
Як не спіцца цяпер вартавым.

І праходзім, маўклівыя, часта,
Выбіраючы радасны шлях,
Каля сцен старадаўніх зубчастых,
Каля Троіцкай вежы Крэмля.

За музеем, над Краснаю плошчай,
Дзе заветны стаіць маўзалей,
Вецер сцягі высока палошча,
Але думы лунаюць вышэй:

Перад намі — пад сонцам комуны
Адзінаццаць рэспублік-сясцёр;
Перад намі — з дзяржаўнай трыбуны
Выступае касец і шахцёр;

Перад намі — нарком абароны,
Першы маршал і першы салдат,
Баявыя выходзіць калоны
На агульнанародны парад;

Перад намі — на поўначы дзікай
У пустэльнях растуць гарады,
На абшарах радзімы вялікай
Зацвітаюць палі і сады,

Ажываюць заводы і домны,
Гоман поўніць прасторы дарог...
І вырастае Леніну помнік
У легенду людскіх перамог.

Ён — жывы, ён — бяссмертны, ён — вечны,
Покуль сэрцы ў грудзях жывуць,
Покуль людзі пад сонцам спрадвечным
Безупынна да шчасця ідуць.

Дружнай сілай сялян і рабочых
Будаваў гэты помнік жывы
Самы смелы ў гісторыі зодчы,
Самы мудры ў вяках большэвік.

Аляксандр Шарапаў

НАША ЗЯМЛЯ

На гумне абмалачваюць хлеб малады,
Да зямлі нагінаюцца важка сады.
Зерне чыстае сейбіт нясе на палі,
Гэта наша багацце і слава зямлі.
З гэтай роднай зямлі, дзе ляглі курганы,
Гналі панскую зграю народа сыны.

Каб мінуўшчыны цень па загонах не лёг,
Мы рукамі ў палях вырывалі быльнёг.
Над радзімай маёй узнялася зара —
Кожны дом, кожны двор поўны скарбу-дабра,
Бо зямлю, што паліта крывёю бацькоў
Сталін наш запісаў нам навекі вякоў.

Ходзіць пан Радзівіл каля нашай мяжы.
Не забыў ён маёнткаў, дзе княжыў, дзе жыў.
Ды не быць груганy на калгасных палях,
Не сядзець з сваім кодлам на нашых хлябах.
З гэтай роднай зямлі, дзе ляглі курганы,
Гналі панскую зграю народа сыны.

Звер драпежны фашысцкія точыць клыкі
На зямлю, што аддадзена нам на вякі,
Дыверсантаў-шпіёнаў ён шле за кардон,
Дапамогі чакае ад здраднікаў ён
Ды кароткі гестапаўскіх наймітаў шлях —
Карны меч дыктатуры ў надзейных руках.

Калі грымне вайною ці Захад ці Ўсход,
Сілай грознай уздымецца волат-народ.
Каб заўсёды з праслаўленых вежаў Крэмля
Асвятлялася зорамі наша зямля,
Бо зямлю, што паліта крывёю бацькоў,
Сталін наш запісаў нам навекі вякоў.

З рускай мовы пераклаў
Аркадзь КУЛЯШОЎ.

Каштоўнае пачынанне

Ні адно рэволюцыйнае свята, ні [illegible] значная падзея ў жыцці краіны не абыходзіцца без актыўнага ўдзелу мастакоў-самавучак. Яны рысуюць плакаты, лозунгі, партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, ярка і маляўніча афармляюць трыбуны, святочныя аркі, будынкі сельсоветаў і праўленняў калгасаў, культурныя ўстановы і г. д. Мастакам-самавучкам, як правіла, даручаюць мастацкае афармленне насценных газет, многія з іх забяспечваюць сваімі малюнкамі і карыкатурамі раённыя газеты.

Асабліва вялікі ўдзел прынялі мастакі-самавучкі ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Яны не толькі рысавалі плакаты, лозунгі, транспаранты, партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета, але далі рад мастацкіх карцін. Так, напрыклад, мастак-самавучка, рабочы Бурбінскага лесаўчастка (Сенненскага раёна) К. Старавойтаў нарысаваў для выбарчага ўчастка дзве карціны на тэму новай і старой вёскі. Мастак-самавучка К. Ф. Жураўлёў, ён-жа рэдактар насценгазеты калгаса «Новае жыццё», Аршанскага раёна, нарысаваў партрэты таварышоў Сталіна і Варашылава, дэпутатаў Вярхоўнага Совета тт. Навіцкага і Жабрэва, даў некалькі малюнкаў і плакатаў. Калгаснік Н. І. Мартыноўскі з калгаса «Рассвет», Сазонаўскага сельсовета, Дубровенскага раёна, нарысаваў партрэты Леніна і Сталіна, выпусціў мастацка афармленую насценгазету, прысвечаную выбарам.

Мастак-самавучка м. Лёзна тав. Азаркевіч нарысаваў партрэты дэпутатаў Вярхоўнага Совета тт. Лявіцкага і Кавалёва, некалькі мастацкіх плакатаў. Пачынаючая [illegible] Жуніц з Лёзна забяспечыла раённую газету шасцю малюнкамі, прысвечанымі выбарам. А. В. Жыркевіч з Гарадка (Віцебская выбарчая акруга) мастацка аформіў два выбарчых участкі, гарадскую арку.

Гурток выяўленчага мастацтва пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце паставіў перад сабой і паспяхова вырашыў больш складаную задачу. Гурток сваімі сіламі аформіў выстаўку, зрабіўшы 150 дыяграм, лозунгаў, плакатаў, партрэтаў і панно, прысвечаных Сталінскай Канстытуцыі і выбарам у Вярхоўны Совет. Удзельнік гэтага гуртка мастак-самавучка Кудрэвіч даў панно «Сталін і народы СССР», партрэт таварыша Сталіна і копію з карціны Сварога «Штаб Кастрычніка». Гурток таксама прыняў удзел у афармленні выбарчых участкаў і тэрыторыі інстытута.

Такіх прыкладаў можна прывесці яшчэ дзесяткі.

Вялікая работа, праведзеная мастакамі-самавучкамі БССР у часе выбарчай кампаніі, з'яўляецца надзвычайна каштоўным пачынаннем.

Па БССР, па няпоўных даных, налічваецца 350—400 мастакоў-самавучак. Гарадскія, раённыя і сельскія арганізацыі павінны часцей звяртацца да іх дапамогі.

Набліжаецца XX гадавіна стварэння нашай гераічнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, набліжаецца Міжнародны комуністычны жаночы дзень, дзень Парыжскай комуны і МОПРа. Самадзейныя мастакі могуць і павінны прыняць ва ўсіх рэволюцыйных святах самы актыўны ўдзел.

Календар літаратуры і мастацтва

Сто год таму назад, 28 студзеня 1838 года ў маскоўскім ваенным шпіталі памёр таленавіты рускі паэт Аляксандр Іванавіч Палежаеў.

Сын дваровай дзяўчыны і памешчыка, соцыяльны адшчапенец, страсны палітычны паэт, які ўсёй істотай сваёй ненавідзеў самадзяржаўе, — Палежаеў, затраўлены Нікалаем І і яго жандарамі, з'яўляецца трагічнай фігурай у гісторыі грамадска-палітычнага жыцця Расіі.

Яшчэ будучы студэнтам, Палежаеў адважваецца ўзняць галаву «вышэй узроўню, начэртанага імператарскім скіпетрам», адважваецца звярнуцца ў паэме «Сашка» да сваёй радзімы з заклікам звяржэння самаўладства:

Когда ты свергнешь с себя бремя
Своих презренных палачей.

Данос, які атэставаў паэму, як «напоўненую карцінамі распусты і самымі пагубнымі для юнацтва думкамі», быў прычынай таго, што Палежаеў па асабістаму загаду Нікалая І быў аддадзены ў салдаты, дзе ён і прабыў да канца жыцця пад жорсткім наглядам.

Але гэта не зламіла свабодалюбівы дух паэта. Яшчэ з большаю сілай загучала ў яго песнях, вершах і паэмах нянавісць да цара і катаў. Непамерна бліжэй стаў ён да народа і ўсё часцей і часцей стаў гаварыць пра рэволюцыйную сілу народа.

Грамадскую накіраванасць сваёй паэзіі, рэволюцыйным яе характарам, рэалізмам, агітацыйнай лірычнасцю, блізасцю да народа — усім гэтым Палежаеў аказаўся ў пачатку таго шляху, які мы называем шляхам рэволюцыйна-грамадзянскай паэзіі

***

28 студзеня спаўняецца 10 год з дня смерці вядомага іспанскага пісьменніка Бласко Ібаньеса.

Нарадзіўся Бласко Ібаньес у 1867 годзе. Ён заваяваў сусветную славу першымі ўжо сваімі раманамі. За сваё жыццё Бласко Ібаньес надрукаваў звыш 30 раманаў, рад зборнікаў апавяданняў і навел, некалькі апісанняў сваіх падарожжаў і цэлы рад перакладаў на іспанскую мову твораў еўрапейскай мастацкай і гістарычнай літаратуры.

Бласко Ібаньес знаёмы совецкаму чытачу па перакладах яго твораў на рускую мову. Ён нам дарагі перш за ўсё як пісьменнік-грамадзянін, як пісьменнік, які звязаў сваю творчасць з рэволюцыйнай барацьбой свайго народа.

Звыш трыццаці разоў ён падвяргаўся турмнаму заключэнню і неаднаразова высылаўся з Іспаніі. Апошнія годы свайго жыцця Бласко Ібаньес жыў у Францыі, эміграваўшы туды ў 1923 годзе, пасля ўсталявання дыктатуры Прымо дэ Рывера. Бласко Ібаньес рашуча стаў пад сцяг антыфашысцкага фронта, сцяг барацьбы з фашызмам, які так высока ўзняты ў нашы дні іспанскім народам, што змагаецца за сваё канчатковае вызваленне.



В. В. Куйбышэў

(ДА 3-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ)

25 студзеня 1935 года памёр Валерыян Уладзіміравіч Куйбышэў, член Палітбюро ЦК ВКП(б), намеснік старшыні Совета Народных Камісараў СССР і старшыня Камісіі Совецкага Кантролю — буйнейшы арганізатар перамог соцыялізма.

Жыццё палкага большэвіка, вернага ленінца абарвалася, калі В. В. Куйбышэў быў у самым росквіце сіл.

В. В. Куйбышэў нарадзіўся ў гор. Омску 7 чэрвеня 1888 года. Маленства сваё і юнацтва правёў ён у невялікім гарадку Кокчэтаў (Кокчатаў) Казахскай ССР.

Скончыўшы кокчэтаўскую пачатковую школу, 10-гадовы Куйбышэў паступіў у І клас омскага кадэцкага корпуса. З самага маленства Валерыян Уладзіміравіч праяўляў вялікую прагу да ведаў і любімым яго заняткам было чытанне. Ён чытаў Тургенева, Дастаеўскага, Пісарэва, Мельнікава-Печэрскага, Пісемскага і творы іншых класікаў.

У Омску, яшчэ падлеткам, В. В. Куйбышэў звязваецца з рэволюцыйна настроенай моладдзю, знаёміцца з рэволюцыйнай літаратурай — чытае надрукаваныя на гектографе брашуры Салтыкова-Шчэдрына — «Вяленая вобла», Л. Талстога — «Н. Палкін», Войніч — «Овад» і інш.

У 1905 годзе, будучы студэнтам Пецербургскай ваенна-медыцынскай акадэміі, тав. Куйбышэў, як член большэвіцкай арганізацыі, выконвае адказныя даручэнні партыі па распаўсюджванню нелегальнай літаратуры, хаванню і перавозцы зброі.

У Ваенна-медыцынскай акадэміі тав. Куйбышэў знаходзіўся менш года і быў выключан за ўдзел у студэнцкіх «непарадках».

Малады В. Куйбышэў, поўны жыцця, сіл, рэволюцыйнай энергіі, у часе першай рускай рэволюцыі прыехаў да сябе на радзіму ў Сібір; авеяны бурамі рэволюцыйных класавых баёў пецербургскага пролетарыята, ён прынёс у Сібір непрымірымасць і паслядоўнасць прафесіянальнага рэволюцыянера-ленінца і вялікі вопыт падпольнай рэволюцыйнай работы.

Омск, Томск, Каінск, Петрапаўлаўск — вось вехі яго большэвіцкага рэволюцыйнага шляху.

Хто з партыйцаў, удзельнікаў большэвіцкага падполля Сібіры не памятае маладога пролетарскага рэволюцыянера Валерыяна, пачаўшага сваю работу яшчэ ў 1904 годзе ў соцыял-дэмакратычных гуртках Омска!

Многае ўспамінаюць старыя партыйцы Сібіры аб рабоце там тав. Куйбышава. У сваёй рабоце ён выявіў сябе закончаным большэвіком, непрымірымым і паслядоўным змагаром і выкрывальнікам контррэволюцыйных дзеянняў і планаў меншавікоў.

У 1906 годзе на омскай гарадской канферэнцыі В. В. Куйбышэў быў арыштаваны і змешчаны ў Омскую турму, а ў сакавіку 1907 года, з-за недастатковасці доказаў, прыгавораны да месячнага турэмнага зняволення.

Куйбышэў быў вопытным арганізатарам і кіраўніком народных мас, і нездарма начальнік томскага жандарскага ўпраўлення даў указанне томскаму губернатару, што «калі-б Валерыян Куйбышэў па суду аказаўся апраўданым, то заслаць яго ў аддалёныя мясцовасці Сібіры пад гласны нагляд паліцыі».

Скрозь цяжкія этапы барацьбы, скрозь холад, голад і катаванні прышоў Валерыян Уладзіміравіч да Кастрычніцкай рэволюцыі. Наступіў новы важны перыяд у яго жыцці, перыяд жорсткай барацьбы двух класаў, якія сышліся грудзі ў грудзі на палях бітвы.

Партыя пасылае яго на самыя важныя франты. Ён становіцца на чале паволжскага пролетарыята, які змагаецца з чэхаславакамі, эсэраўскімі і меншавіцкімі бандамі.

І ўсюды, куды-б ні пасылала яго партыя, ён праяўляў уласцівую яму мужнасць, шчырасць, працаздольнасць і бязмежную адданасць справе рэволюцыі, справе партыі Леніна—Сталіна.

У перыяд рэканструкцыі народнай гаспадаркі, у перыяд сталінскіх пяцігодак з імем Куйбышава звязана многае ў развіцці нашай прамысловасці, выхаванні кадраў, складанні планаў развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Непахісная мужнасць, беззаветная адданасць партыі і яе правадырам—Леніну і Сталіну, непахісная вера ў перамогу соцыялізма, гатоўнасць на любыя цяжкасці і афяры для перамогі соцыялізма — асноўныя рысы большэвіка В. В. Куйбышава.

Смерць Куйбышава была цяжкой стратай для народаў вялікай совецкай радзімы.

Імя гэтага палкага, нястомнага барацьбіта за справу партыі Леніна—Сталіна, за шчасце і радасць народаў СССР, блізкага і дарагога ўсім працоўным нашай радзімы, будзе жыць вечна.

Два зборнікі народных песень аб Чырвонай Арміі

Секцыя этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР падрыхтавала да друку два зборнікі народных песень аб нашай гераічнай Чырвонай Арміі і абароне соцыялістычнай радзімы.

Першы зборнік—на беларускай мове — **«Чырвоная Армія і абарона радзімы ў беларускай народнай творчасці»** — выходзіць пад рэдакцыяй акадэміка Якуба Коласа і змяшчае каля 30 песень, звыш 100 прыпевак і каля 30 прыказак і загадак.

Другі зборнік—на яўрэйскай мове — **«Яўрэйскія народныя песні аб Чырвонай Арміі»** — змяшчае каля 15 песень і 25 прыпевак. Гэта першы зборнік яўрэйскага совецкага фальклору ў СССР. Абодва зборнікі з'яўляюцца яркім выражэннем высокіх пачуццяў совецкага патрыятызма і бязмежнай любві працоўных Совецкай Беларусі да сваёй соцыялістычнай радзімы і Чырвонай Арміі. У кожнай песні, у кожнай прыпеўцы — пастаянная гатоўнасць у любы момант выступіць на абарону Совецкага Саюза ад нападу ворага.

Зборнікі выйдуць з друку да XX гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота і з'явяцца каштоўным падарункам чырвонаармейцам, рабочым і калгаснікам.

Дзейсна змагацца за социялістычнае мастацтва



«Менахем-Мендл» у Яўрэйскім Дзяржтэатры (рэжысёр М. Сокал). На здымку: (эправа налева): артыст А. Трэпель у ролі Менахем-Мендла, артыст М. Моін у ролі рэб Ошэра. Фота І. Каплінскага.

Творчы калектыў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР 13, 14 і 15 студзеня абмяркоўваў загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР аб ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда.

Уступную інфармацыю зрабіў рэжысёр тэатра тав. Галаўчынер. Ён указаў на прычыны ідэйнага і мастацкага банкроцтва тэатра імя Мейерхольда, расказаў аб варожай, шкоднай дзейнасці Мейерхольда, аб скажэнні ім, ва ўгоду левацкаму трукацтву і фармалістычным выбрыкам, класічных п'ес, аб антысовецкай лініі ў рабоце тэатра.

Але тав. Галаўчынер у сваёй прамове не даў разгорнутага аналізу шкоднага ўплыву Мейерхольда на творчасць тэатра БССР, належнай крытыкі пастановак Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР і сваіх уласных фармалістычных памылак. Вядома, што яўрэйскі тэатр, дзе арудваў заклятьі вораг народа, стварыў рад наскрозь фармалістычных, варожых, антысовецкіх спектакляў.

Уплыў фармалістаў і ў прыватнасці Мейерхольда на творчасць рэжысёраў і актораў тэатра быў надзвычай моцны. Глыбокая крытыка фармалістычных трукацтваў, варожых нашаму социялістычнаму мастацтву, аналіз ранейшых і апошніх работ тэатра, а таксама вострая, самакрытычная ацэнка тав. Галаўчынерам уласных фармалістычных работ маглі-б узняць абмеркаванне загада Камітэта на патрэбную прынцыповую вышыню, дапамагчы творчаму калектыву разгарнуць крытыку памылак тэатра і зрабіць правільныя вывады для далейшай работы. Тав. Галаўчынер толькі ўспомніў аб ранейшых шкодных і фармалістычных пастаноўках яўрэйскага тэатра, аб уласных-жа памылках і становішчы тэатра зараз абмежаваўся агульнымі выразамі.

Прынцыповыя пытанні творчай работы, пытанні барацьбы з фармалістычнымі элементамі ў тэатры не былі ўзняты ў спрэчках. Выступаўшыя работнікі тэатра абмяжоўваліся крытыкай арганізацыйнай работы і асобных непаладкаў у тэатры.

Аб няправільнай расстаноўцы сіл, незадаволенасці існуючым парадкам размеркавання ролей мастацкім советам тэатра гаварылі акторы тт. Аропчык, Сокал, Вольпіна, Цымераў.

Патрэбна ўмацаванне мастацкага кіраўніцтва тэатра. Патрэбны вопытныя рэжысёры. Замест гэтага Ўпраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР пасылае ў тэатр у якасці рэжысёра тав. Блетніцкага, які не мае вопыту рэжысёрскай работы. На гэта ўказваў у сваёй прамове актор тав. Рывін.

Неабходнасць умацавання вопытнымі работнікамі і адміністрацыйнага кіраўніцтва тэатра адзначалі тт. Броткін, Цымераў.

Творчы калектыў тэатра, ліквідуючы вынікі шкодніцтва, зараз напружана працуе над пастаноўкамі п'ес совецкіх драматургаў і лепшых твораў класікі, над стварэннем патрэбнага нашаму гледачу рэпертуара. Тэатр вылучае рэжысёраў — з свайго акторскага складу. Вылучэнне на рэжысёрскую работу т. Трэпеля, Моіна, Сокала сябе цалкам апраўдала. Творча расце акторская моладзь. У апошніх пастаноўках асноўныя ролі дадзены маладым акторам. Але нельга супакойвацца на дасягнутым. Патрэбна ў далейшым напружаная творчая праца, смелае высоўванне моладзі, устанаўленне непарыўнай сувязі з гледачом. Аб гэтым гаварылі тт. Герцберг, Цыпкіна, Олендэр.

Адсутнасць сувязі з гледачом, адрыў ад грамадскасці, невысокую мастацкую якасць работ тэатра адзначыў на сходзе культработнік фабрыкі імя Кагановіча тав. Зальцман.

Выступаўшыя на сходзе работнікі тэатра выказвалі сваё незадавальненне і крытыкай работы тэатра ў нашым друку. Агульнае адмаўленне ўказаных крытыкай памылак у рабоце тэатра і адсутнасць самакрытыкі ў адносінах творчых пытанняў на самім сходзе, сведчаць аб нездаровым імкненні замаўчаць допушчаныя памылкі ў апошніх пастаноўках, сведчаць аб шкоднай самасупакоенасці работнікаў яўрэйскага тэатра.

Гэтай самасупакоенасці спрыяе і выступленне тав. Патацкі (Ўпраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР), які падтрымаў агульнае адмаўленне правільнасці крытыкі ў нашым друку.

На нездаровыя ўзаемаадносіны ў калектыве тэатра, наяўнасць элементаў сямейнасці, а таксама на дрэнную работу мастацкага совета тэатра ўказала пераважная большасць актораў, выступаўшых на сходзе. Усе гэтыя пытанні, недастаткова асветленыя ў спрэчках, павінны быць дэталёва разгледжаны партыйнай і профсаюзнай арганізацыямі тэатра з тым, каб аздаравіць работу, узняць на належную вышыню большавіцкую крытыку і самакрытыку.

Творчыя работнікі Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР у сваіх выступленнях і ў прынятай пастанове аднадушна вітаюць загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР аб ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда, як важнейшы палітычны дакумент накіраваны супроць фармалізма і іншых варожых уплываў у нашым мастацтве.

Трэба адзначыць, што абмеркаванне пытанняў творчасці і агульнага становішча ў яўрэйскім тэатры праводзілася заўсёды ізалявана ад грамадскасці, ад гледачоў. І зараз, пры абмеркаванні важнейшых пытанняў сваёй далейшай работы ў святле загада Камітэта, тэатр не забяспечыў прысутнасці на сходзе пісьменнікаў, крытыкаў, актораў іншых тэатраў, прадстаўнікоў рабочага гледача. На сходзе не былі ўзняты на прынцыповую вышыню асноўныя творчыя пытанні, не была дастаткова разгорнута крытыка і самакрытыка. Гэтыя пытанні павінны быць завостраны ў штодзённай працы творчага калектыва тэатра. Патрэбны не бясконцыя разважанні «аб перабудове», а рашучая і канчатковая ліквідацыя вынікаў шкодніцтва, дзейсная барацьба за праўдзівы рэалізм, за социялістычнае мастацтва.

А. Б.

УРЫ ФІНКЕЛЬ

У отэлі „Імперыяль“

(Урывак з кнігі „Шолам-Алейхем“)



Шолам-Алейхем у Петраградзе ў 1904 годзе.

Вось ужо тры дні, як Шолам-Алейхем і ўсё яго сямейства не жыве ў сваёй сталай кватэры.

Іх там няма.

Яны збеглі адтуль, каб ратавацца, каб ратаваць сваё жыццё.

Вось ужо тры дні, як Шолам-Алейхем і яго сямейства хаваюцца ў отэлі «Імперыяль».

Яны не адны. Разам з імі знаходзяцца там яшчэ сотні сем'яў.

Спалоханыя, туляцца яны адзін да другога.

Яны хаваюцца тут ад смерці, якая тры дні ўжо лютуе над Кіевам-горадам.

Гэтую смерць нясуць цалыя хеўры хуліганаў, паліцэйскіх, царскіх салдатаў. Яны бадзяюцца з дзікімі спевамі, п'яныя выгукі «ура» нясуцца следам за імі. На шмат якіх вуліцах забілі пагромшчыкі не аднаго бацьку, не адну маці, не адно дзіцё, не аднаго рэволюцыйнага рабочага, работніцу.

Падкуплены швейцар, з іконай у руках, стаіць ля дзвярэй отэля. Ён запэўнівае пагромшчыкаў, што ў отэлі «Імперыяль» знаходзяцца толькі богабаязныя, набожныя хрысціяне.

Раптоўная думка мільганула ў галаве Шолам-Алейхема. Як гэта можна сядзець тут пад аховай іконы, як гэта можна ратавацца самому, пакінуўшы народ, бедны народ, у руках раз'юшаных забойцаў і разбойнікаў.

Але няшчасныя бежанцы, што знайшлі сабе прытулак у отэлі «Імперыяль», пад аховай швейцара і яго іконы, не адпусцяць Шолам-Алейхема.

І вось сядзіць ён бледны, узбуджаны. Усё цела яго дрыжыць ад хвалявання. А за вокнамі «чуецца д'ябалаўскі крык, кружыцца танец смерці. Змяшаліся ў адно цэлае свіст і грукат, удары, трэск, лямант і смех... і ўра! Змяшаліся разам—кроў і асколкі, валасы, кавалкі паперы, мозг, парваныя кнігі і пралітае віно — у дзіўную мешаніну рэчаў».

Ён уцячэ адсюль, дзе гвалтуе гэтае жудаснае пекла, што завецца пагромам. Ён не хоча тут быць. Ён уцячэ — далёка, далёка. Ён паедзе па Еўропе і па Амерыцы. Царызму — «патрэбны грошы... ён увесь у даўгах, нават валасы па ім не яго ўласныя». Яму няма чым плаціць свае даўгі. Царызм—«пускаецца на ўсялякія аферы, абы дамагчыся хоць невялікай пазыкі ад Еўропы ці Амерыкі».

Ён, Шолам-Алейхем, будзе выступаць на вялікіх мітынгах і сходах у Нью-Іёрку, у Берліне, у Парыжы, у Лондане. Ён будзе ўплываць на банкіраў, каб яны не давалі пазык для цара. Ён абавязкова паедзе. Ён павінен ехаць.

Але Шолам-Алейхем ашукаўся ў Ротшыльдах і ў Мендэльсонах таксама, як і яго героі з Касрылаўкі. Ён думаў, што яны сапраўды блізка прымаюць да сябе кроўныя інтарэсы яўрэйскіх народных мас, хоць сам ён неаднойчы, зусім аб'ектыўна, адмаўляў гэта ў сваіх творах.

І як толькі спынілася дзікае «ура» на кіеўскіх вуліцах, як толькі пер'е, што лётала ў паветры, упала на брук і зноў стала ціха ў горадзе Кіеве, — Шолам-Алейхем пачаў клапаціцца адносна свайго ад'езду з Расіі. Праз месяц пасля пагрому піша ён аднаму з сваіх знаёмых, прафесару, у Нью-Іёрк:

— «Калі знойдзецца цяпер які-небудзь яўрэй-мільянер з пазыкай, дык ён заража без нажа шэсць мільёнаў яўрэяў, акрамя сотні мільёнаў неяўрэяў. Іх кроў падзе на яго галаву. Калі вы скажаце гэта праз друк, вы зробіце нам вялікае дабро. Зрабіце-ж гэта!»

Так распачаў Шолам-Алейхем сваю прапаганду ў замежных краінах супроць пазыкі для царызма. Яму хацелася, каб у Амерыцы ўбачылі хоць-бы праз тэатр тую гераічную барацьбу, якую вядуць народы ў Расіі за сваё вызваленне. Ён піша для тэатра драму «Апошняя афяра, альбо крывавыя дні».

У тыя самыя дні, калі Шолам-Алейхем выступаў супроць пазыкі для царызма, пасылае ён у Амерыку гэты свой драматычны твор. Гэта п'еса павінна была, паводле яго думак, стварыць такую ілюзію, каб кожны з гледачоў у Нью-Іёрку меў-бы права сказаць: «І я быў у Расіі ў тыя крывавыя дні».

Ён звярнуўся зноў да свайго новага твора, які ён толькі-што паслаў у Амерыку, і, перагледзеўшы ўсіх дзеючых асоб п'есы, спыніўся на вобразе Ейліка Дратвы:

— Вельмі ўдзячная роля для добрага трагіка, — думаў ён. — Малады шавец, соцыял-дэмакрат. Дый наогул, здаецца мне, усе акторы забяспечаны,—сказаў ён сам сабе і, крыху саромячыся свайго вялікага таленту, дадаў:

— Гэта не я забяспечыў, само жыццё забяспечыла.

Так, само жыццё спрыяе таму, каб кожны вялікі талент адлюстроўваў тыя ці іншыя часы рэчаіснасці. І з выключнай сілай адлюстраваў яе вялікі талент Шолам-Алейхема.

З яўрэйскай мовы пераклаў

Віт. ВОЛЬСКІ.

Л. Фіглоўская

А. С. СЕРАФІМОВІЧ

Да 75-годдзя з дня нараджэння

Александр Серафімавіч Серафімовіч—адзін са старэйшых совецкіх пісьменнікаў, з імем якога звязана развіццё пролетарскай літаратуры. Уся літаратурная дзейнасць Серафімовіча шчыльна звязана з ростам і развіццём рэволюцыйнага руху ў Расіі.

Совецкі народ высока ацэньвае свайго любімага пісьменніка, пісьменніка-большэвіка, аўтара класічнага твора «Жалезны паток».

Нарадзіўся А. С. Серафімовіч (Папоў) 7 (20) студзеня 1863 года ў станіцы Ніжне-Курмаярскай, б. Данской вобласці.

Будучы студэнтам 1 курса фізіка-матэматычнага факультэта Пецербургскага універсітэта, Александр Серафімовіч трапляе ў асяроддзе рэволюцыйнай моладзі, знаёміцца са старэйшым братам В. І. Леніна— Александрам Ульянавым, вывучае Маркса.

У сваім нарысе «Як мы чыталі Маркса» Серафімовіч піша: «Мы не маглі адыйсці: жалезнымі зуб'ямі нас захватваў і ўцягваў у твор Маркс, і ўжо нельга было вырвацца... І мы ўпершыню не толькі зразумелі, але і адчулі класавую непрымірымасць... І сярод змроку царскага і буржуазнага ўладарання для нас загарэўся ў далечыні асляпляюча яркі агонь надыходзячага, і наўкруг пасвятлела: з'явіўся сэнс жыць, працаваць і змагацца».

Сваю літаратурную дзейнасць Серафімовіч пачаў у далёкім Мезені, куды быў сасланы ў 1887 годзе за адозву да насельніцтва, у якой ён прабаваў растлумачыць сэнс няўдалага замаху на Александра III групы народавольцаў на чале з А. І. Ульянавым.

Тут у 1888 годзе Серафімовіч і напісаў сваё першае апавяданне «На ільдзіне».

Пасля трох год ссылкі пісьменнік быў высланы пад нагляд паліцыі ў станіцу Усць-Медзведзіцкую, дзе і пражыў да 1902 года. Да гэтага часу адносіцца рад яго апавяданняў — «Стрэлачнік», «Маленькі шахцёр», «Сяміпкура», «Пад зямлёй» і іншыя, у якіх адлюстраваны страшэнныя карціны горкага, бяэрадаснага жыцця працоўных мас царскай Расіі. Пісьменнік-рэаліст нарысаваў нам яркія вобразы прыгнечаных і абяздоленых людзей, усё жыццё якіх — галеча, нечалавечая праца і жудаснае бяспраўе.

Вось перад чытачом загнаны і забіты стрэлачнік, які гіне ў выніку бязлітаснай эксплаатацыі, рабочы, замучаны адурваючай, непасільнай працай, сцэпшчык, які жорстка паплаціўся за спробу давесці свайму начальству, што «правоў такіх няма, каб морду біць людзям», лесаруб, плытагон, пямор, якія здабываюць мізэрныя сродкі на існаванне.

Цяжкае ўражанне ад суровага і страшнага жыцця народных мас узмацняецца змрочнымі фарбамі пейзажа, якім аўтар часта аздабляе апавяданне. Тутою вее ад «магільнай цішыні», «змрочнага лесу», «панурых хвой», «безжыццёвых туманаў».

У сваіх ранніх творах Серафімовіч выступіў суровым і бязлітасным выкрывальнікам самадзяржаўнага ладу,ператвараўшага людзей працы ў рабоў. Але, апісваючы працу, як прытупляючую і знясільваючую ў буржуазным грамадстве, пісьменнік падкрэслівае, што і ў гэтых умовах праца ўсё-ж немінуча выпрацоўвае ў людзях велізарную ўпартасць, здзіўляючую трываласць і мужнасць.

Праўда, класавая барацьба ў ранніх творах Серафімовіча не паказана ва ўсёй паўнаце: вобразы эксплаатватараў зарысаваны агульна; не паказаны яшчэ шляхі барацьбы з капіталістычным ладам: найбольш характэрнымі героямі з'яўляюцца рабочыя і сяляне, у якіх ледзьве прыкметны праблескі класавай свядомасці.

Рэволюцыя 1905 года бліжэй падводзіць пісьменніка да паказу пролетарыята, які ўсведамляе сваю ролю ў класавай барацьбе. Апавяданні 1905—1907 год прысвечаны не толькі выкрыццю капіталістычнай рэчаіснасці гэтай «халоднай, жывой турмы», але і закліку да ўзброенай барацьбы з гэтай рэчаіснасцю. Асноўныя героі, выведзеныя ў гэтых апавяданнях, абгрунтоўваюць свае соцыяльныя правы і неабходнасць змагацца за іх. У апавяданні «Мёртвыя на вуліцах» нарысаван рабочы, які цвёрда ўпэўнены ў немінучасці рэволюцыі і ў перамозе працоўных.


Тое-ж можна сказаць і пра апавяданне «Пахавальны марш», дзе паказана рабочая дэманстрацыя, да якой далучыліся салдаты.

«І ў гэтым тустым, усё запаўняючым гуле крокаў чулася горлая сіла, пазнаўшая самую сябе».

У радзе апавяданняў гэтых год пісьменнік падкрэслівае не толькі рэволюцыйны рух працоўных, але і неабходнасць саюза рэволюцыйнага пролетарыята з працоўным сялянствам, падкрэслівае кіраўнічую ролю рабочага класа.

«...Таварышы... — гаворыць рабочы-слесар, — успомніце венік: расперабі—і ўвесь па прутіку ламай, а звяжы, папрабуй пераламаць». (Апавяданне «Сярод ночы»).

Пісьменнік бачыць, што рабочы клас вырастае ў магутную сілу. Ён бачыць, як гераічна змагаюцца дружыннікі на барыкадах Краснай Прэсні. Сваё апавяданне «На Прэсні» Серафімовіч і прысвячае паказу маскоўскага снежаньскага паўстання, апісанню гераічных баёў паўстаўшага пролетарыята.



А. С. СЕРАФІМОВІЧ.

Адлюстраванню героікі рэволюцыйнай барацьбы цалкам адпавядае і той эмацыянальны-прыўзняты тон, у якім напісана большасць апавяданняў.

Гэтыя апавяданні былі магутным сродкам рэволюцыйнага выхавання мас.

«Вашы апавяданні аб удзельніках першай рэволюцыі (расказвалі аўтару самі рабочыя шмат год пасля — Л. Ф.) штурхнулі нас на рэволюцыйную дзейнасць. Па чытаеш, як людзі кроў пралівалі, як змагаліся, і самога за сэрца хапае: няўжо заставацца ў баку і вечна цярпець на сваёй шыі гэтых катаў?!

Кідаліся таксама наперад, у агонь»...

У 1910 годзе паяўляецца буйны твор буйнага майстра «Горад у стэпу», над якім Серафімовіч працаваў некалькі год (1906—1910).

«Горад у стэпу», як і ўся папярэдняя творчасць пісьменніка, узвышаецца на буржуазнай рускай літаратурай эпохі рэакцыі, як маяк. Пісьменнік адлюстроўвае ў гэтым творы пранікненне капіталізма ў Расію ў 90-я годы мінулага стагоддзя.

Буржуазнае будаўніцтва і рост капіталістычнага горада на голым стэпу — асноўная тэма твора. Горад узнікае адначасова з будаўніцтвам жалезнай дарогі. Вырастаюць шматлікія пабудовы, з якіх найбольш характэрнымі для нараджаючагага буржуазнага горада аказваюцца шынок, публічны дом, астрог, а затым і могільнік. Жывучы ў неймаверна цяжкіх умовах рабочыя, па ўласных іх словах, «патамілі ся дзяцей на пахаванне цягаць».

Крывавы і агідны злачынны рост капітала паказан тут надзвычай рэльефна. Драпежніцкая прырода капіталізма з выключнай праўдзівасцю і смеласцю пісьменніка-рэаліста агалены ў гэтым творы. Праз цынічна-адкрытую прамову старшыні акцыянернага таварыства, якое будуе жалезную дарогу, Серафімовіч раскрывае сутнасць і прынцыпы буржуазнага будаўніцтва.

«Для мяне (гаворыць гэты старшыня— Л. Ф.) важна адно — канчатковы рэзультат. Ці расстрэльвайце вы рабочых, ці вядзіце з імі перамовы, ці рабіце ўступкі да вядомых граніц,—канешне, не гэта важна. Важна, каб да вядомага тэрміну зыйшла поўная колькасць вагонаў, паравозаў, каб правільна ішоў рух, каб падтрымоўваўся неабходны рамонт шляху. Дасягаеце вы гэтага масавым расстрэлам — добра, знаходзіце больш выгадным пусціць у ход перамовы, уступкі — яшчэ лепш. Толькі канчатковы рэзультат, астатняе мяне не датычыць».

Такім чынам — будаўніцтва на касцях, на крыві, на грошы, награбленых ў працоўных, — будаўніцтва, якое суправаджаецца сярэдневяковым вымагацельствам, рабункам і разбоем, намаганнямі крыважэрных людзей, якія не грэбуюць ніякімі сродкамі.

Эксплаататарская сутнасць капіталізма, хцівая сіла ўласнасці з надзвычайнай сілай выкрыта ў вобразе прагнага «чумагага» шынкара і растаўшчыка Захаркі, што вырастае ў заводчыка-прадпрыемцу, «гвалтаўніка і абіралу» Захара Караедава.

«Захарка — машэннік і абкруціць кожнага вакол пальца. Але Захарка-ж і першы чалавек, што выплывае ў гэтым ванітроўным жыцці, і ў яго аднаго толькі ўзвышаецца двухпавярховы дом, жаўцеюць новым цёсам вароты, парканы...».

Разам з буржуазіяй Серафімовіч з бязлітаснасцю рэаліста выкрывае і буржуазна-ліберальную інтэлігенцыю ў асобе інжынера Польнава і студэнта Пеці.

Прадстаўнікам эксплаататарскіх класаў супроцьстаіць рабочая маса, якая перажывае побач з прыгнечаннем і запрыгоненнем працэс палітычнага росту.

Сілу паўстаючага рабочага класа адчувае і буржуазія. Рост Караедавых з дня на дзень працякае ў трывожнай абстаноўцы.

«І чакаеш чагосьці, быццам нябачная птушка, чапляючы крылом, пасылае тонкі, за душу хапаючы крык».

Рабочая маса, пры ўсёй неразгорнутасці паасобных вобразаў, выступае ў пісьменніка як арганізаваная, згуртаваная маса, упэўненая ў праваце і перамозе сваёй справы.

У гэтым праявіўся пільны позірк мастака соцыялістычнага рэалізма, які не толькі гістарычна правільна намаляваў карціну буржуазнага горада канца XIX і пачатку XX стагоддзяў, адлюстраваўшы яго асноўныя супярэчнасці, але і ўскрыў лінію развіцця гістарычнай рэчаіснасці. Вось чаму «Горад у стэпу»—значны твор Серафімовіча, адзін з найлепшых твораў у дарэволюцыйнай пролетарскай літаратуры наогул.

У перыяд імперыялістычнай вайны Серафімовіч прадаўжае справу рэволюцыйнага пісьменніка, пісьменніка-байца за шчасце народнае. У радзе апавяданняў — «На пабыўку», «Шрапнель», «Сустрэча» і інш. пісьменнік ускрывае класавую сутнасць імперыялістычнай вайны — страшэннай і бяссэнсавай мясарубкі, гаворыць аб ператварэнні імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую.

«Як ні нявечыць, як ні крамсае, як ні забівае нас страшная сапраўднасць, як ні мучаюцца знявечаныя, — а ёсць жыццё, а б'юцца сэрцы, і хто ведае, як навальнічна будзе парушана гнятучае маўчанне, з якім страшэнным грукатам рухне лад». («Сустрэча»).

Пасля Лютаўскай рэволюцыі Серафімовіч цалкам аддаецца грамадска-партыйнай рабоце.

«Пісаў лістоўкі, адозвы па заданнях Маскоўскага Совета і МК РКП(б)» — гаворыць аб сабе пісьменнік. З 1918 года ён—член партыі большэвікоў. У годы грамадзянскай вайны,—55-ці год ад роду,— паехаў на фронт у якасці карэспандэнта «Праўды».

У 1924 годзе Серафімовіч стварае класічны твор совецкай літаратуры — «Жалезны паток».

У аснове гэтай гераічнай эпапеі ляжыць апісанне гістарычнага паходу Чырвонай Арміі, якая адступала з насельніцтвам у 1918 годзе на Кубані пад націскам контррэволюцыі.

У творы паказаны гераічны совецкі народ, які крывёю сваёю абараняў заваёвы Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Захапляючыя вобразы безымянных людзей, што ўзнялі сваю зброю супроць адвечнага прыгнечання і подласці — у цэнтры твора.

Серафімовіч выразна раскрывае прычыны, якія прымусілі беднату, працоўнае казацтва, для якіх «прыход совецкай улады разам прыадкрыў краёчак над жыццём», — узняцца з родных, наседжаных месцаў і рушыць на злучэнне з асноўнымі сіламі чырвоных войск.

З вялікай мастацкай усхваляванасцю і суровай праўдзівасцю апісвае Серафімовіч гэты здзіўляючы паход гіганцкай лавы людзей з усім сваім багаццем, жанчынамі, дзецьмі і старымі, праз горы і стэпы, кроў і хваробы, скрозь гарачыню, пыл і дождж. Галодныя, напоўраздзетыя, дрэнна ўзброеныя людзі ў часе гераічнага паходу ператварыліся ў магутную, грозную, свядомую сілу, зліліся ў непераможны жалезны паток.

Невымернымі былі пакуты народа. Пяцьсот вёрст таманскага паходу заліты крывёю байцоў і дзяцей, услалены трупамі забітых і хворых. Людзі паміралі, але не здаваліся. Яны, аб'яднаныя адным жаданнем—жыць і перамагчы, праламвалі ісці наперад. Яны перамаглі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў.

«Жалезны паток» — гэта выдатны твор пра гераізм і бясстрашнасць магутнага совецкага народа. Вялікая сіла «Жалезнага патока» перш за ўсё ў народнасці.

Аўтар «Чапаева» Д. Фурманаў так ацэньваў «Жалезны паток» і ўсю дзейнасць Серафімовіча: «Ніколі не гнуўся і не адступаў гэты крэмнёвы чалавек — ні ў выпрабаваннях, ні ў спакусах жыццёвых. Ніколі, ні аднаго разу не сышоў з баявога шляху, ніколі не сфальшывіў ні ў жыцці, ні ў літаратурнай працы, застаючыся моцным і ў той час, калі ўпала духам і апусціла бездапаможна рукі так званае «перадавое» грамадства... Ад першага апавядання «На ільдзіне» да апошняй цудоўнай аповесці «Жалезны паток» Серафімовіч усё той-жа песняр барацьбы працы з капіталам, барацьбы свабоднага ладу з царствам галечы, гвалту, эксплаатацыі».

Серафімовіч—адзін з любімых пісьменнікаў нашага часу. Вялікі Ленін высока ацэньваў творчасць Серафімовіча. Даведаўшыся, што ў 1920 годзе на фронце быў забіт сын Серафімовіча, Владзімір Ільіч зараз-жа напісаў яму сяброўскае, цёплае пісьмо, у якім даў бліскучую характарыстыку творчасці пісьменніка.

«...Вашы творы і расказы сястры ўнушылі мне глыбокую сімпатыю да Вас, і мне вельмі хочацца сказаць Вам, як патрэбна рабочым і ўсім нам Ваша работа і як неабходна для Вас цвёрдасць цяпер, каб перамагчы цяжкі настрой і прымусіць сябе вярнуцца да работы...».

Совецкі народ любіць і паважае свайго пісьменніка. А. Серафімовіч — адзін з папулярнейшых нашых совецкіх пісьменнікаў, на творах якіх выхоўваецца маладое пакаленне краіны соцыялізма.

АРХІТЭКТУРА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭПОХІ

Мы знаходзімся ля вытокаў соцыялістычнай архітэктуры. Па лепшых пабудовах нашай краіны ўжо бачым наглядное раскрыццё соцыялістычнага прынцыпа ў архітэктуры, які выражае сабою максімальныя клопаты аб жывым чалавеку, бачым у гэтых пабудовах і новыя нормы соцыялістычнай эстэтыкі. Ярчэй за ўсё мы бачым гэта на прыкладзе савецкага павільёна на Парыжскай выстаўцы, будуемага Палаца Саветаў, лепшага ў свеце маскоўскага метро і многіх іншых пабудоў.

Велізарны шлях прарабіла за годы савецкай улады і архітэктура Савецкай Беларусі. Казачна выраслі і ўпрыгожыліся будаваны па праекту беларускіх архітэктараў Воінава і Варабсіна. Тут упершыню ў беларускай практыцы мы ўжо бачым спробу перапрацоўкі і прыстасавання ў архітэктуры антычных ордэраў.

Асабліва звяртае на сябе ўвагу ўдалае вырашэнне галоўнага партала палаца, які ўяўляе сабою манументальную каланаду з высунутымі наперад скульптурамі. Арыгінальна вырашаны і капітэлі калон, выражаныя лепкай лісцяў і піонерскага кастра.

У афармленні палаца шырока ўжыты скульптурная лепка і жывапіс. Удала дадзены ў інтэр'ерах таксама дуб, арэх, ясень і чынара. Па сваёй архітэктуры, па лінскіх школ і рабочых клубаў. У суседстве з Гомелем пабудаван адзін з буйнейшых у Саюзе шклозавод і вялікі рабочы гарадок. Такая-ж карціна ў Віцебску, Магілеве, Оршы і ў іншых гарадах Савецкай Беларусі. Найбольш старыя гарады Беларусі, як Менск, Віцебск і Магілеў, за годы савецкай улады па матэрыяльных укладах у будаўніцтва прарабілі шлях, роўны стагоддзям іх мінулай гісторыі. Змяняецца абліччa гарадоў і вёсак.

Гарады дарэвалюцыйнай Беларусі, як і ўсёй старой Расіі, забудоўваліся хаатычна, па капрызах прыватных уласнікаў. Мы-ж будуем нашы гарады па строгаму плану, які прадугледжвае развіццё вытворчых сіл і забудову на многія годы наперад. Такі генеральны праект планіроўкі і далейшай рэканструкцыі гарадоў Менска, Віцебска, Гомеля, Магілева, Оршы, Бабруйска і Полацка.

Праўда, было-б няправільным думаць, што ўсё ў гэтых праектах планіроўкі добра. На некаторыя з іх мела ўплыў подлая работа ворагаў народа, якія арудвалі адзін час у Наркамгасе і ў некаторых горсаветах Беларусі. Асабліва гэта датычыць праекта планіроўкі гор. Полацка, які складзены па паніжаных нарматывах гаспадарчага развіцця горада і не ўлічвае яго прымежнага становішча. Усё гэта абавязвае нас з асаблівай пільнасцю перагледзець усе наяўныя ў нас па планіроўны і рэканструкцыі гарадоў праектныя работы, выкінуць з іх усё варожае, каб гарады нашы раслі і развіваліся па бальшэвіцкаму плану.



Новы Менск. НА ЗДЫМКУ: пабудова новай гасцініцы (рог вул. Кірава і Урыцкага).

Фото І. Каплінскага.

нашы гарады, непазнавальным стала і абліччa беларускай вёскі. На былых пустырах, на брудных і цёмных некалі ўскраінах грамадамі паверхаў высяцца цяпер новыя фабрыкі і заводы, новыя рабочыя пасёлкі. Пейзаж калгасных вёсак узбагаціўся школамі, бальніцамі, клубамі, паркамі. Асабліва ярка відаць развіццё савецкай архітэктуры на пабудовах Менска, сталіцы ордэнаноснай БССР.

У савецкай архітэктуры, як вядома, доўгі час панаваў канструктывізм.

У Менску канструктывізм меў уплыў галоўным чынам на пабудовах да 1932 года, калі ў горадзе было шырока разгорнута прамысловае і жыллёвае будаўніцтва. Да пабудоў тых год адносяцца многія жылыя дамы як у цэнтры горада, так і на ўскраінах. Дамы гэтыя ўяўляюць сабою голыя шматпавярховыя каробкі, з аляпаватымі балкончыкамі і ў рэдкіх выпадках—з неразвітымі пілястрамі. Па ўнутранай планіроўцы жыллёвых кватэр і па сваіх мізэрных выгадах дамы гэтыя далёкія ад тых патрабаванняў, якія мы цяпер прад'яўляем да архітэктуры жылля.

З пабудовай Дома ўрада ў архітэктуры Менска наметаўся рэзкі адыход ад канструктывізма. Гэта паказаў і ўсесаюзны конкурс на лепшы праект Палаца Саветаў. У архітэктуры Дома ўрада больш за ўсё прыцягвае да сябе ўвагу яго ўдалае аб'ёмнае вырашэнне. Будынак, будучы расчлененым на масу аб'ёмаў, выглядае ў той-жа час маналітным. кампазіцыйна цэльным. У вялікіх размерах прадстаўлены тут і сінтэз мастацтваў. У афармленні Дома ўрада знайшлі ўжытак і скульптурная лепка і жывапіс.

У другой пяцігодцы, следам за маскоўскімі і ленінградскімі архітэктарамі, над пошукам новых, больш родных духу савецкай эпохі архітэктурных форм узмоцнена пачынаюць працаваць і беларускія архітэктары. Прыкладам такой работы з'яўляецца Палац піонераў у Менску, пабагацце аддзелкі сваіх шматлікіх памяшканняў і багацце абсталявання палац гэты з'яўляецца яркім увасабленнем сталінскай любві і клопатаў аб нашых шчаслівых дзецях.

Яшчэ больш ярка выражана работа па асваенню і перапрацоўцы культурнай спадчыны ў архітэктуры Дома Чырвонай Арміі. Своеасабліва трактуе класічны ордэр аўтар праекта архітэктар Лангбард, ён надаў фасаду дома магутныя трохчацвяртныя, добра разлічаныя на светацень, часта расстаўленыя калоны. Што-ж датычыць да антаблемента—падкалоннай часткі, дык на выступаючых аб'ёмах ён павінен быць запоўнены скульптурным фрызам. Фрыз гэты надасць фасаду яшчэ большую выразнасць.

Калі фасад дома сваёй манументальнасцю і строгасцю выражае як-бы сілу і магутнасць нашай доблеснай Чырвонай Арміі, дык па сваёй унутранай планіроўцы і афармленню, па прызначэнню яго шматлікіх памяшканняў ён выражае шматлікія запатрабаванні і высокую ваенную і агульную культуру нашых слаўных байцоў і камандзіраў. У Доме ёсць вучэбныя габінеты, лабараторыі, пакоі адпачынку, добрая канцэртная зала, вялікі водны басейн і дзесяткі іншых памяшканняў. Гэта цудоўны камбінат культуры і адпачынку.

Вельмі багата чаго можна расказаць і аб архітэктуры закончанага пабудовай у 1937 годзе Дома партыйных курсаў, а таксама будуемых Вялікага тэатра оперы і балета, будынка Акадэміі навук БССР і новай гасцініцы. Усе гэтыя пабудовы гавораць аб вялікім росце архітэктуры Савецкай Беларусі, аб творчым росце беларускіх архітэктараў і будаўнікоў.

Гэты рост мы можам прасачыць на прыкладзе кожнага горада нашай рэспублікі. У Гомелі, на былым пустыры, пабудаван гігант сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва—Гомсельмаш, над апранутымі ў асфальт і брусчатку вуліцамі высяцца грамады новых жыллёвых дамоў, ста-

Гаворачы аб дасягненнях архітэктуры Савецкай Беларусі, нельга абысці маўчаннем і апошнія праектныя работы беларускіх архітэктараў. Да лепшых з іх трэба аднесці праект акадэмічнага кінотэатра, які намечана пабудаваць у Менску на будучай Плошчы Саветаў. Аўтарам гэтага праекта, архітэктарам Варакcіну і Столеру ўдалося знайсці як для фасада, так і для ўнутранай планіроўкі кінотэатра лаканічнае, удалае вырашэнне.

Неабходна адзначыць таксама каштоўны эскізны праект памянёнай вышэй Плошчы Саветаў, распрацаваны архітэктарамі Мураўёвым і Брэгманам. Плошча гэта, як вядома, размесціцца на левым беразе Свіслачы, улева ад Савецкай вуліцы.

Над цікавымі праектамі Дома цэнтральнага архіва БССР (які намечана пабудаваць у Магілеве), над праектамі жыллёвых дамоў і гараджскіх паркаў працуюць цяпер і іншыя архітэктары Беларусі. Шкада толькі, што нашы архітэктары да гэтага часу не звяртаюць належнай увагі на пытанні калгаснай архітэктуры. Гэта вялікая недахопнасць. Яна павінна быць навярстана энергічным умяшаннем нашых архітэктараў як у планіроўку новых калгасных вёсак, так і ў распрацоўку архітэктуры калгаснага жылля.

За годы савецкай улады на ўсёй нашай краіне, у тым ліку і ў нашай рэспубліцы, прароблены велізарныя будаўнічыя работы. Гэтым работам у трэцяй сталінскай пяцігодцы будзе нададзены яшчэ большы размах. Зразумела, што якаснае ажыццяўленне гэтых работ ва многім будзе залежаць ад нашых архітэктараў. Трэба, каб нашы архітэктары яшчэ больш дзёрзалі творча, працавалі і вучыліся працаваць яшчэ лепш, авалодваючы светапоглядам сталінскай эпохі, увасабляючы ў архітэктурных вобразах трыумф бальшэвіцкай справы, апраўдваючы на справе вялікае званне савецкіх архітэктараў.

А. ДАЛІН.

ДЖОРДЖ ГАРДОН БАЙРАН.

Развітанне ЧАЙЛЬД-ГАРОЛЬДА

(З паэмы «Паломніцтва Чайльд-Гарольда»)

Бывай, бывай! За сіняю вод
Радзімы бераг знік;
Над морам вецер, хваль узлёт
І чайкі сумны крык.
Заходзіць сонца; меркне свет;
Мы мчым за небакрай.
Заходу, сонцу — мой прывет! —
Дабранач, родны край.

2.

Міне кароткі час начы,
Дзень новы прыдзе жыць.
Я-ж стрэну шыр марскіх пучын
І высь нябёс чужых.
Як здань, пустынны замак мой
Глядзіцца ў люстра вод;
Старынны вал зарос травой,
Пёс вые ля варот.

3.

Мой хлопчык-паж, скажы па кім
Так плачаш, аслабеў?
Ці ярасць хваль, вятроў марскіх
Нязносна для цябе?
Расінкі слёз сатры з павек, —
Надзейна, моцна снасць!
Наш сокал быстры ўдаль плыве
Шмат весялей за нас.

4.

«Ні ветру свіст, ні хваль прыбой
Не ў страх мне, сэр Гарольд!
Не дзіва сум, — я хвор душой,
Страшыць дум чорных рой.
Ад бацькі, маці адыйсці
Без жальбы я не мог.
Цяпер сябры ў маім жыцці —
Ты і ўсявышні бог».

5.

Мне бацька, з горам на душы,
Праводзячы сказаў:
«А маці будзе ўсё тужыць, —
Вярніся-ж хоць назад...».
«Не плач, не ный, дзіця маё,
Ты-ж знаеш сам аб тым, -
Што я, каб сэрца меў тваё,
То-б плакаў, як і ты.

6.

Ты бледны, збраеносец мой,
Твар пастарэў і хмур.
Ці ты страшышся люты бой
Стрэць з ворагам, ці бур?»
«О, не! Я з страхам не знаём.
Я з страхам не дружу.
Шкада малых: я кінуў дом,
Па жонцы я тужу.

7.

Яна з дзяцьмі бліз вас жыве,
Над возерам якраз.
Сыны спытаюць пра мяне, —
Які ім дасць адказ?»
Не плач-жа! Сум свой заглушы.
Я рад спагаду мець.
Зірні, — са смехам на душы
Бягу я з родных месц.

8.

Слязам прытворлівых жанчын
Не вер! Усё ў міг міне:
Ад'едзеш — слёзы ўтрэ, другіх
Праз дзень кахаць пачне.
Мне-ж дзён мінуўшых не шкада;
Вось толькі боль шчыміць,
Што аб усім, што кінуў там,
Не варта слёзы ліць.

9.

Я сірата, шум хваль марскіх
Душу вяселіць мне.
Чаго-ж мне плакаць па другіх,
А хто па мне ўздыхне?
Хіба сабака ўспамяне
Выццём, а ў мой зварот,
Другім накормлены, мяне
Укусіць ля варот.

10.

Праз шторм, праз бурных хваль каскад
Мы мчым на караблі;
Зямлі я ўсякай буду рад,
Апроч сваёй зямлі.
Прывет свой, хвалі, шлю я вам
І ў старане чужой
Магілам змрочным, круцізнам.
Даруй, край родны мой.

Пераклад з англійскай мовы **І. СЕМЕЖОНАВА.**



Горкаўскі музей у Маскве. НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд першага і другога залаў.

Фото Д. Шварцмана.

75 год ДЗЯРЖАЎНАЙ ЛЕНІНГРАДСКАЙ КАНСЕРВАТОРЫІ

У студзені споўнілася 75 год з дня заснавання Дзяржаўнай ленінградскай кансерваторыі.

У змрочную эпоху царствавання Аляксандра II, выдатны рускі кампазітар Антон Рубінштэйн узняў пытанне аб арганізацыі ў Расіі кансерваторыі, у якой маглі-б развівацца і атрымоўваць вышэйшую адукацыю не толькі прадстаўнікі арыстакратыі, але і таленавітыя выхадцы з народа.

Існаваўшыя ў 50-х гадах мінулага стагоддзя розныя прыватныя музычныя школы, курсы ў Пецярбурзе, якія таксама былі на ўтрыманні прыватных асоб, не маглі забяспечыць належнае развіццё музычнай асветы ў Расіі. Найбольш значную работу ў гэты час вяло рускае музычнае таварыства, якое ўзначальваў Балакіраў, кіраўнік так званай «магутнай кучкі», у склад якой уваходзілі кампазітары Мусаргскі, Барадзін, Глазуноў, Рымскі-Корсакаў і Кюі. Таварыствам была створана капела, арганізоўваліся канцэрты, якія папулярызавалі творы рускіх кампазітараў.

Не гледзячы на шматлікія перашкоды, якія ставіў бюракратычны апарат царскай Расіі па шляху развіцця мастацтваў А. Рубінштэйну ўдалося атрымаць дазвол на арганізацыю кансерваторыі.

Першым рэжысёрам і дырэктарам кансерваторыі быў заснавальнік яе Антон Рубінштэйн. Выкладчыкамі ў кансерваторыі з'яўляліся — першы вучань Рубінштэйна, буйнейшы рускі кампазітар Чайкоўскі і такія майстры музыкі, як Веняўскі, Ауэр. Пазней працавалі ў кансерваторыі і такія выдатныя кампазітары, адыграўшыя вялікую ролю ў пашырэнні музычнай асветы ў Расіі, як Рымскі-Корсакаў і Глазуноў.

Дарэвалюцыйная гісторыя кансерваторыі — гэта гісторыя барацьбы перадавых людзей таго часу з рэакцыйным, чорнасоценным апаратам царскай Расіі, з душыцелямі асветы і культуры.

Толькі ў наш, савецкі час Ленінградская кансерваторыя атрымала ўсе магчымасці для свайго развіцця, плённай дзейнасці і стала выдатнай вышэйшай навучальнай установай СССР, якая рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў музычнага мастацтва.

Мастацкім кіраўніком кансерваторыі з'яўляецца заслужаны дзеяч мастацтваў М. О. Штэйберг — вучань Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Глазунова.

Кансерваторыя выхавала слаўную плеяду савецкіх майстроў музыкі. Ленінградскую кансерваторыю скончылі І. Дзяржынскі, Д. Шастаковіч, О. Чэшко і многія іншыя, вядомыя нашай грамадскасці маладыя савецкія кампазітары.

У многіх гарадах Савецкага Саюза працуюць выпускнікі Ленінградскай кансерваторыі. І ў нас, у Савецкай Беларусі, таксама працуюць выпускнікі Дзяржаўнай ленінградскай кансерваторыі: у Тэатры оперы і балета БССР—віяланчэліст О. Л. Кузнец, у Кансерваторыі майстар фортэп'яннай ігры тав. Бергер, малады педагог па класу трамбона тав. Рубанчык, у Дзяржаўным дзіцячым тэатры БССР — малады дырыжэр тав. Белкін і іншыя.

Дзяржаўная ленінградская кансерваторыя зараз па праву займае адно з першых месц сярод вышэйшых навучальных музычных устаноў Савецкага Саюза.

А. РАТНЕР,

выхаванец Дзяржаўнай ленінградскай кансерваторыі, дырыжор Тэатра оперы і балета БССР.

АЛЬБОМ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Секцыя этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР рыхтуе да выдання альбом беларускага народнага мастацтва. У альбоме будуць прадстаўлены ўсе віды народнага мастацтва: ткацтва, пляценне, вязанне і вышыванне, у тым ліку народны арнамент, ліванная вытворчасць, мастацкая апрацоўка дрэва (разьба, выпальванне, мазаіка, інкрустацыя), скульптура, кераміка, мастацкая апрацоўка металу, музычныя інструменты беларускіх майстроў, разрысоўка і гравіроўка шкла і каменя т. д.

Для альбома будуць скарыстаны, апрача калекцыі Акадэміі навук, зборы менскага і віцебскага дзяржаўных музеяў, калекцыі Эрмітажа і музеяў Масквы і Ленінграда, а таксама экспанаты нядаўна закрытай у Менску ўсебеларускай выстаўкі народнай творчасці. У альбоме будуць таксама прадстаўлены звыш дзесяці ўзораў сусветна вядомых слуцкіх паясоў.

Аб'ём альбома — 250 старонак.

Матэрыял падабраны. Альбом выйдзе з друку ў канцы 1938 года.

Ю. Дворкіна

БАЙРАН

(Да 150-годдзя з дня нараджэння)

23 студзеня 1788 года нарадзіўся вялікі англійскі лірык Джордж-Ноэль-Гардон Байран. Значэнне Байрана ў гісторыі сусветнай літаратуры велізарнае. Ён, як лірык, з'яўляецца адным з трох найвялікшых лірыкаў заходне-еўрапейскай літаратуры XIX стагоддзя, займаючы пачэснае месца побач з Гейне і Гётэ. На пэўным адрэзку часу Байран з'явіўся ўладарнікам дум маладога пакалення. Ён адлюстраваў у сваіх творах супярэчанні, якія былі ўласцівы маладому чалавеку яго эпохі, геніяльна выразіў яго пакуты і надзеі, сумненні і спадзяванні. Байран з'явіўся найбольш буйным прадстаўніком «сусветнага смутку», які перажывала моладзь эпохі бесчасоўя.

Нарадзіўся Байран у збяднелай арыстакратычнай сям'і. Яшчэ ў юнацтве ён атрымаў тытул лорда. Але ён выхоўваўся ў духу перадавых ідэй Французскай рэвалюцыі, захапляўся Вальтэрам, Руссо — асветнікамі, што «прасвятлілі французскія галовы для надыходзячай рэвалюцыі» (Энгельс).

Юнацтва Байрана праходзіць ужо ва ўмовах жорсткай рэакцыі, што ахапіла Еўропу пасля 1815 года. Малады паэт адчуваў, як задыхаецца Еўропа ў ціскax «Свяшчэннага саюза», ён быў сведкай таго, як бязлітасна распраўлялася рэакцыя з лепшымі людзьмі эпохі, як душыла яна ўсякія парасткі свабодалюбівых ідэй. Байран бачыў, як англійская буржуазія дапамагала самым рэакцыйным краінам Еўропы — Аўстрыі, Прусіі і Расіі душыць Французскую рэвалюцыю. І першыя гукі байранаўскай ліры былі гукамі гневу і нянавісці па адрасу гэтых слупоў рэакцыі. Амаль з самага пачатку яго творчасці, у зборніку «Часіны досугу» гучаць матывы варожасці да англійскага грамадства, расчаравання ў ім.

Для чего-же сходиться мне с модной
толпой,
Преклонясь пред ее вожаками,
Славословить нелепость трусливой
душой
И завязывать дружбу с глупцами?
Испытал я и сладость и горечь любви,
Рано искренней дружбе поверил,
Обсуждают матроны порывы мои
И узнал я, что друг лицемерил.

З прыкрасцю пераконваецца Байран у тым, што царства свабоды, роўнасці і брацтва буржуазія не стварыла і што панаванне буржуазіі ёсць непрыкрытая ўлада золата, грашовага мяшка. І паэт адштурхоўваецца ад гэтай брыдотнай карціны, крытыкуючы грамадства, кідаючы яму ў твар папрокі, поўныя гневу і пагарды.

Мир не любя, любим я не был миром,
Его дыханью грубому не льстил,
Не поклонялся я его кумирам
И уст моих улыбкой не кривил, —

піша Байран аб сваіх адносінах да грамадства.

У сваіх рэзкіх выступленнях супроць вярхушкі Англіі паэт часта змыкаўся з народнымі масамі, з дэмакратычнай апазіцыяй. Будучы членам палаты лордаў, надзвычайна энергічна выступіў малады паэт на абарону «луддэітаў», рабочых — разбуральнікаў машын. Паўстанне рабочых і ломка машын былі выклікаты жахлівай галечай ткачоў. Байран рэзка абрушыўся на праект увядзення для іх смяротнага пакарання.

У адным з вершаў на гэтую тэму Байран піша:

Не странно-ль, что если является
в гости
К нам голод и слышится вопль бедняка,
За ломку машины ломаются кости
И ценятся жизни дешевле чулка.
А если так было, то многие спросят:
Сперва не безумцам-ли шею свернуть,
Которые людям, что помощи просят,
Лишь петлю на шее спешат затянуть.

Байран абараняе ў парламенце незалежнасць Ірландыі, клейміць рэакцыйныя тэндэнцыі палаты лордаў. Усё гэта знаходзіць адлюстраванне і ў яго паэзіі. Супроць Байрана ўзнялося ўсё англійскае вышэйшае грамадства. Паэта літаральна зацкавалі. Цкаванне пранікнула і ў сямейнае жыццё паэта, у выніку чаго яму прышлося пакінуць навекі сваю радзіму.

Байрана вабіць да сябе Ўсход. Пад уплывам ідэй Руссо, якога ён называе «апосталам свабоды», Байран аддае перавагу краінам, не скалечаным буржуазнай цывілізацыяй. Яго цягне да простых, сумленных людзей, да іншых, нееўрапейскіх нораваў і звычаяў. Яго вабяць да сябе гераічныя, бяскрайнія страсці, якія, як яму здаецца, захаваліся толькі ў тых краінах.

Рэзультатам вандравання Байрана па Ўсходу з'явілася яго дзівосная паэма «Чайльд Гарольд». Тут ва ўсёй паўнаце раскрываецца супярэчлівасць светапогляду паэта. Сусветны смутак, песімізм, пачуццё адзіноты спалучаюцца тут з палкім пратэстам супроць тыраніі ва ўсіх яе праяўленнях, маркотныя ноты смутку спляталюцца са страснымі заклікамі да барацьбы за свабоду. З Чайльд Гарольдам у творчасці Байрана адкрываецца вялікая галерэя «лішніх людзей», бунтароў-адзіночак, людзей бесчасоўя, якія ўмелі страсна ненавідзець, але не бачылі шляхоў барацьбы, не знаходзілі саюзнікаў. Адсюль той песімізм, якім прасякнута лірыка Байрана.

У ёй гучаць матывы адзіноты, пакуты. У лірыцы Байрана маркотныя ноты раздаюцца з асаблівай сілай.

Я — одинок. Средь волн морских
Корабль меня несет.
Зачем мне плакать о других!
Кто-ж обо мне вздохнет?
Мой пес, быть может, два-три дня
Повоет, да и тот,
Другим накормленный, меня
Укусит у ворот.

Гэтыя матывы гучаць у «Яўрэйскіх мелодыях», дзівосных па сіле лірызма і задушэўнасці, у яго «Усходніх паэмах» і г. д. Байран — выключны майстар пейзажаў, якія шчыльна звязаны з светаадчуваннем яго герояў. Рад яго лірычных вершаў даюць цудоўныя па майстэрству карціны прыроды, дзе адпачывае душой адзінокі вандроўнік. Адзінокі, горды герой, які кідае выклік старым арыстакратычным рэакцыянерам і новым буржуазным ханжам, які пратэстуе супроць свету хлусні і золата, які адстойвае сваю незалежнасць, — вось улюбёны вобраз Байрана.

Значэнне творчасці геніяльнага паэта заключалася ў тым, што індывідуальны пратэст героя перарастаў у пратэст лепшых людзей яго эпохі, што яго бунтарскія імкненні выражалі пачуцці і імкненні перадавых людзей таго часу. Вобраз бунтара-адзіночкі праходзіць праз усю творчасць паэта, то ў выглядзе вандруючага Чайльд Гарольда, то ў вобразе таемных герояў «Усходніх паэм» («Лара», «Гяур»), то ў выглядзе рамантызаванага разбойніка, які помсціць ненавіснаму грамадству ў тых-жа «Усходніх паэмах» (Канрад з «Карсара», Селім з «Абідоскай нявесты»). Паэт узрушае чытача палкім пратэстам Праметэя, заражае нянавісцю да грамадскай і сусветнай несправядлівасці словамі Каіна. Усе вобразы Байрана насычаны магутнымі эмоцыямі, усе яны — носьбіты страснага абурэння і гневу паэта. Багацце псіхалагічных замалёвак, тонкіх нюансаў і перажыванняў у «Шыльёнскім вязні» яшчэ ярчэй адцяняюць надзвычайнае майстэрства і сілу паэта. Паэма «Шыльёнскі вязень» з'яўляецца страсным гімнам свабодзе, палкім абурэннем супроць турэмшчыкаў.

Шэдэўрам думак і бунтарскіх пачуццяў паэта з'яўляецца яго філасофская драматычная паэма «Каін». Байран зусім адмаўляецца ад біблійскай трактоўкі вобраза Каіна. У кожным вобразе адцуранага паэт перш за ўсё бачыў бунтара, адрынутага грамадствам. І фігура Каіна насычана сапраўднымі гуманістычнымі імкненнямі. Каін не хоча мірыцца з несправядлівасцю



Байран у албанскім касцюме.

бога. Ён не хоча шанаваць яго сляпа і рабска-пакорліва, ён хоча пранікнуць у сэнс быцця. Гэтая паэма — апафеоз свабоднай крытычнай думкі. У вобраз Каіна Байран уклаў свае лепшыя думкі і пачуцці, сцвердзіў права асобы на крытычныя адносіны да рэчаіснасці. Тут таксама з асаблівай сілай сказваецца любоў да чалавецтва, да надыходзячых пакаленняў. Праўда, тут магутна гучаць і матывы песімізма, нават роспачы.

Нельга не адзначыць яго сатырычнай паэмы «Відзенне суда», дзе Байран здзекуецца з англійскіх каралёў. «Каін», «Відзенне суда» і т. п. творы выклікалі выццё ханжаскіх англічан. Байрана трэціравалі, як бязбожніка і нечасціўца, назваўшы яго нават правадыром «сатанінскай школы».

«Ода к Венецыі», «Да Напалеона», «Бронзавы век» — тут Байран вельмі ярка характарызуе палітычнае жыццё Еўропы эпохі рэакцыі.

Нарэшце, вялікае месца ў паэзіі Байрана займаюць нацыянальна-вызваленчыя матывы. Вораг усякай тыраніі — паэт усклікае:

Но все, что человечество гнетет,
Всегда во мне противника найдет.

Заклікамі да нацыянальна-вызваленчага руху, які пахіснуў-бы асновы рэакцыі, манархіі і самадзяржаўя, напоўнена вялікая колькасць твораў Байрана («Чайльд Гарольд», «Ода к Венецыі», рад вершаў, прысвечаных Італіі, Грэцыі, Іспаніі). «Паўстань, о Грэцыя, паўстань!» — усклікае геніяльны паэт-бунтар, які аддаў пасля жыццё за свабоду гераічнага народа.

Ён малюе жыццё прыгнечаных народаў, смуткуе аб іх былой велічы. Але заўсёды ў яго вершах гучыць вялікая вера ў сілу народа, у яго здольнасць скінуць ярмо прыгнятальнікаў. Радкі з «Чайльд Гарольда» з асаблівай сілай гучаць у нашы дні, калі гераічныя народы Іспаніі і Кітая змагаюцца за сваю незалежнасць супроць фашызма — японскага, нямецкага, італьянскага. Вера ў перамогу народа над дэспатычнымі прыгнятальнікамі прадстаўляе сабой лепшыя, дэмакратычныя тэндэнцыі паэзіі Байрана.

Ён гаворыць аб іспанскіх барацьбітах: «...Іх усіх мы глыбока шануем, любячы волі святло». Байран апявае гераічнае супраціўленне іспанскага народа сваім ворагам:

Вооружась ножом иль ятаганом,
Чтоб жен спасать, сестер и дочерей,
Они боролись на смерть с вражьим
станом,
Струилась кровь врагов ручьем
багряным...
Так следует встречать непрошенных
гостей.
Ужель печальных жертв борьбы тяжелой
Слезой мы не почтим? Разорены
Нещадною войной поля и села
И кровью руки жен обагрены.

Апяваючы храбрасць іспанскага народа, яго энергічнае супраціўленне ворагам, яго гатоўнасць змагацца, не шкадуючы жыцця, Байран не абыходзіць і вобраз іспанскай жанчыны, мужнай дачкі гераічнага народа.

Когда-б ваш слух ее ласкали речи,
Вы не могли-б поверить, что с враждой
Она искать с войсками станет встречи
И с ними, не страшась опасной сечи,
Близ саррагосских стен в кровавый всту-
пит бой.
Ее любимый пал — она не плачет,
Пал вождь — она становится вождем...
Удерживает трусов, храбро скачет
Пред войском, чтобы с дрогнувшим
врагом
Покончить. Отомстить она сумеет
За друга и за павшего вождя.

«Доблесць і сілу» апявае Байран у іспанскіх жанчынах, і гэтыя рысы перакліkаюцца з гераічным вобразам іспанскіх жанчын нашых дзён.

Не менш энергічна заклікае паэт і Італію прачнуцца ад сну і ўступіць у бой за свае правы. Ён кліча і Ірландзію, і Албанію, і Грэцыю і іншыя прыгнечаныя краіны скінуць з сябе ярмо чужаземнага гнёту. Ён уваскрашае перад імі тыя часы, калі яны былі свабоднымі, ён звяртаецца да свабодалюбівага духу, які ніколі не можа памерці ў народзе.

Сам Байран пасяліўся ў Італіі, бо тут рэакцыі не ўдалося да канца задушыць рэвалюцыйных ідэй. Байран далучаецца да руху карбанарыяў. Энергічны, ініцыятыўны паэт падпаў пад асабліва пільны нагляд аўстрыйскай паліцыі, якая нават умешвалася ў яго інтымнае жыццё.

Вялікую ўвагу перадавой еўрапейскай грамадскасці прыцягвала да сябе барацьба грэкаў за сваё вызваленне ад турэцкага прыгнёту. Лепшыя людзі таго часу з вялікай сімпатыяй сачылі за гэтай барацьбой. Па ўсёй Еўропе пракацілася хваля грэкафільскай паэзіі, апяваўшай і барацьбу сучаснай Грэцыі, і старажытную Элладу, і эллінскі (старажытна-грэчаскі) радасны светапогляд. Апошняе з'ўлялася таксама выклікам эпосе рэакцыі, што абвясціла сярэдневяковы змрочны каталіцызм сваёй рэлігіяй. Першае месца ў грэкафільскай паэзіі належыць Байрану («Афінскай дзяўчыне», «Песня к султанам», «Сёння мне споўнілася 36 год» і інш.). Так, у апошнім, амаль перадсмяротным, вершы паэт заклікае:

...За славный край
Иди на битву с силой мужа
И жизнь отдай!

У пачатку 1824 года Байран накіроўваецца ў Грэцыю, каб прыняць удзел у выступленні супроць туркаў. Ён прыбыў у Місалангі, дзе фармаваўся атрад, але захварэў ліхарадкай і памёр 19 красавіка 1824 года, за некалькі дзён да выступлення.

Творчасць Байрана займае адно з вядучых месцаў у сусветнай літаратуры XIX стагоддзя. «Байранізм» быў буйнейшай літаратурнай плынню ў эпоху рэакцыі. У тую эпоху кожны смелы пратэст, кожнае выступленне супроць рэакцыі рэвалюцыянізавала розумы, бударажыла думкі, штурхала лепшых людзей ад пасіўнага нездавальнення да актыўнага супраціўлення.

Тытанічны пратэст у паэзіі Байрана, які спалучаўся з маркотнымі нотамі яго музы, знаходзіў жывейшы водгук у сэрцах яго сучаснікаў. Вялікі нямецкі паэт Генрых Гейне гаворыць пра сябе: «Сусветная трэшчына прайшла па майму сэрцу». Гэтакжа прайшла яна і па вялікаму сэрцу Байрана. Пад уплывам байранізма знаходзіўся Пушкін, Лермантаў. Песімізм Байрана быў рэзультатам цяжкіх умоў, у якіх прыходзілася тварыць і змагацца паэту. Песімізм яго развіўся ў змрочную пару рэакцыі, калі змагар-адзіночка перажываў пачуццё безвыходнасці і бяссілля. Але, разам з тым, Байран здолеў выразіць думкі, пачуцці і спадзяванні лепшых людзей свайго часу, пахіснуць сваімі палкімі вершамі асновы рэакцыі. У памяці чалавецтва ён застанецца песняром свабоды і барацьбы за яе.

АБ НЕДАХОПАХ У КІРАЎНІЦТВЕ ССП БССР

Ворагі народа нямала нашкодзілі ў галіне літаратуры — і ў сэнсе засмечання кніжных паліц усякай контррэвалюцыйнай дрэнню, і ў сэнсе падрыву штодзённай працы ССПБ.

Быў такі час, калі дыверсанты ад пяра, бездары і п'яніцы, па лёгкадумнасці і палітычнай блізарукасці кіраўніцтва ССПБ, узносіліся на п'едэстал то як «прадстаўнікі пралетарскай паэзіі», то як «пісьменнікі, якія ідуць да пралетарскай літаратуры асаблівым, арыгінальным шляхам», у той час, як дзесяткі сапраўды здольных пісьменнікаў, скромных працаўнікоў, заставаліся ў цяню, а дзесяткі маладых, пачынаючых пісьменнікаў чакалі да сябе ўвагі.

Быў час банкетаў, юбілеяў, узнёслых дэкларацый па адрасу так званых «карыфеяў», быў час, калі кіраўніцтву ССПБ зусім некалі было займацца такімі справамі, як палітвыхаваўчая работа сярод пісьменнікаў, як творчая работа, як работа па вырошчванню таленавітага літаратурнага маладняка.

Комуністычная партыя правяла і праводзіць рашучую барацьбу з усімі і ўсякімі варожымі праяўленнямі ў літаратуры, у выніку якой нямала з тых, хто хаваўся пад маскай «літаратараў», выкрыты як ворагі народа.

Здавалася-б, што гэтая барацьба, якая выкрыла варожыя проіскі ў літаратуры, павінна была-б пакласці канец палітычнай бескляпотнасці ССПБ. Але гэтага не здарылася.

На працягу ўсяго 1937 года мы бачым, што новае кіраўніцтва ССПБ мала што зрабіла для стварэння сапраўды актыўнай творчай атмасферы: не было ў ССПБ палітвыхаваўчай работы з пісьменнікамі — слабая яна і цяпер; мала звяртала ўвагі былое кіраўніцтва на творчую работу—работу секцый, арганізацыю вечароў па абгаварэнню ўжо напісаных твораў і тых, якія пішуцца, арганізацыю вечароў з праблемнымі пытаннямі совецкай літаратуры, — мала звяртае ўвагі на гэту работу і новае кіраўніцтва.

З даўняга часу павялося, што нават на тых нешматлікіх вечарах, якія праводзяцца ў Доме пісьменніка, кіруючыя работнікі ССПБ сваю прысутнасць лічаць залішняй. Так было, напрыклад, з абгаварэннем п'есы З. Бядулі «Салавей», п'есы Клімковіча «Кацярына Жарнасек», кнігі Шашалевіча «Большэвікі граніцы».

Зусім дрэнна наладжана работа з маладымі, пачынаючымі пісьменнікамі. Кіраўніцтва ССПБ абмежавала свае клопаты аб маладых стварэннем зусім не здавальняючага патрабаванні моладзі літгабінета і прыёмам некаторых маладых пісьменнікаў у ССПБ, у той-жа час сотні літаратурных гурткоў у калгасах школах, на заводах, у часцях Чырвонай Арміі, як у Менску, так і ў іншых гарадах, не маюць з боку ССПБ ніякай дапамогі.

Уласна кажучы, у стане масавай літаратурнай работы да гэтага часу знаходзіць адлюстраванне неаднаразова выказваемая ў свой час некаторымі адказнымі кіраўнікамі ССПБ своеасаблівая «тэорыя» аб накіраванні ўвагі галоўным чынам на «творчыя адзінкі», што, як вядома, з'яўляецца не больш ні менш як рэшткамі існаваўшай у свой час у ССПБ групаўшчыны. Кіраўніцтва ССПБ да гэтага часу яшчэ не аўладала тым стылем работы з маладымі кадрамі, дзякуючы якому ў нашай краіне штодзённа, штогадзінна тысячы прадстаўнікоў моладзі высоўваюцца на самыя перадавыя ўчасткі ў розных галінах грамадскай дзейнасці. Баязнь праўлення ССПБ вылучаць моладзь, сведчыць аб неразуменні задач, пастаўленых партыяй і таварышам Сталіным у справе вырошчвання кадраў.

Да асабліва сур'ёзных недахопаў работы ССПБ трэба аднесці кіраванне работай секцый, з якіх адны (напрыклад, руская) існуюць толькі на паперы, другія (скажам, яўрэйская), не зрабіўшы своечасова неабходных вывадаў з варожай дзейнасці былых сваіх кіраўнікоў, знаходзяцца ў стане разгубленасці. Ёсць і такія секцыі, якія як быццам існуюць і нават працуюць, але да гэтага часу не маюць арганізацыйнага твару. Прыкладам служыць паэтычная секцыя, якая не мае да гэтага часу старшыні.

Не спяшаецца кіраўніцтва ССПБ і з ліквідацыяй вынікаў шкодніцтва ў галіне абароннай работы. Вядома, што ў справе ліквідацыі абароннай камісіі нямала пастараліся ворагі народа. Відавочна, што ў выніку развалу абароннай работы ў ССПБ абаронны ўчастак беларускай совецкай літаратуры знаходзіцца ў значным заняпадзе (дастаткова сказаць, што за 1937 год у беларускай совецкай літаратуры не з'явілася ні аднаго больш-менш значнага празаічнага твора аб сучаснай Чырвонай Арміі). Але, не гледзячы на гэта, не гледзячы на тое, што ворагі народа, якія праводзілі сваю дыверсійную работу ў літаратуры, у прыватнасці на яе абаронным участку, выкрыты і ліквідацыя абароннай камісіі кіраўніцтвам ССП СССР прызнана памылкай, — праўленне ССПБ да гэтага часу палец аб палец не ўдарыла, каб аднавіць абаронную работу.

На парадку дня — пытанне аб рабоце ССПБ. Пытанне неадкладнае. Перад совецкай літаратурай стаяць велізарныя задачы, выкананне якіх у вялікай ступені залежыць ад таго, як працуе, як кіруе масай пісьменнікаў праўленне ССПБ, як актыўна яно ў разгортванні штодзённай творчай, арганізацыйнай, палітвыхаваўчай работы як з усёй масай пісьменнікаў, так і з кожным паасобку.

К. ЦІТОЎ.
А. ШАРАПАЎ.

ТАЛЕНАВІТЫ МАЙСТАР

Наша рэспубліка мае багата высока адараных, таленавітых народных майстроў. Яны надзвычай добра валодаюць кісцю, здзіўляюць сваёй выдатнай мастацкай разьбой, умелай лепкай.

Нядаўна закрыўшаяся ўсебеларуская юбілейная выстаўка з'явілася цудоўным аглядам народных талентаў.

Сярод другіх вылучаліся экспанаты бабруйскага разчыка Пятра Хруцкага, майстра-самавучкі.

Пятра Хруцкага з юнацкіх год цягнула да мастацтва. Ён гадзінамі мог прастойваць ля карцін і скульптур, якія яму даводзілася бачыць.

Ён прыстрасціўся выразваць з тоненькіх фанерных дошчачак розныя фігуркі, выкройваць з іх багатыя ўзорчатыя ўпрыгожанні. Рабіў гэта ён так — рукаятку вострага нажа браў у зубы, палавінкай рукі (ён інвалід ад нараджэння — без кісцей рук) прыціскаў дошчачку да шчакі і моцным нажымам рабіў правільныя нарэзы. Спачатку хутка стамляўся. Тады рабіў перапынак на 10—15 мінут, а потым з ранейшай сілай прымаўся за любімы занятак.

Аднойчы ў магазіне ён убачыў добра зробленую шкатулку. Яе бакавыя грані былі пакрыты мастацкімі ўзорамі, а крышка аддзелана тонкай разьбой. Тады ў яго нарадзілася думка выкарыстаць свае мастацкія здольнасці на разьбе на аддзелцы скрыначак, шкатулак, рамак. Гэта-ж таксама мастацтва. Хруцкі пачаў шукаць падыходзячую сыравіну для аддзелкі. Увага яго спынілася на звычайнай саломе. Ён узяў доўгае сцябло саломкі, добра падрэзаў яго на тоненькія ніці, афарбаваў у розныя колеры і атрымаў выдатны матэрыял для інкрустацыі.

Велізарная вытрымка і трываласць у гэтага здольнага чалавека. Ён мог гадзінамі трымаць нож у зубах, цэлымі днямі не пакідаць свайго вытворчага месца, прыдумляючы новыя ўзоры, дзесяткі разоў перастаўляючы тонкія ніці саломак у пошуках той фігуры, якая-б, нарэшце, задаволіла яго высокую патрабавальнасць, патрабавальнасць майстра і мастака.

Слава аб мастацкіх вырабах Пятра Хруцкага, незвычайнага, цудоўнага майстра, разышлася далёка за межы Бабруйска.

Яго запрасілі ўдзельнічаць у юбілейнай усебеларускай выстаўцы. Ён адабраў для яе лепшыя ўзоры сваіх сталярна-мазаічных работ. Гэтыя экспанаты выстаўкі выклікалі ўсеагульнае захапленне. Шкатулкі, аддзеланыя мастацкімі ўзорамі, даўно з'яўляюцца важным прадметам народнага мастацтва. Хруцкі ў сваіх працах выкарыстаў багаты вопыт народа-творца, і, як мастак, змог унесці шмат новага ў гэты каштоўны фонд народнага мастацтва.

На прыкладзе Пятра Хруцкага яшчэ і яшчэ раз пераконваешся ў тым, як бязмежна клапатліва наша маці-радзіма за сваіх таленавітых сыноў і дачок. Для Хруцкага ў Бабруйску адкрыта спецыяльная майстэрня. У майстэрню падабрана таленавітая моладзь, Хруцкаму даверана вучыць яе. Майстэрня забяспечана сыравінай і ўсім неабходным. І гэты моцнай волі чалавек, у азнаку ўдзячнасці краіне, якая клапоціцца аб ім, працуе, не шкадуючы сіл, заўсёды шукае, заўсёды імкнецца да новага.

Урад БССР, цэнячы асаблівыя заслугі Пятра Хруцкага ў справе развіцця народнага мастацтва, узнагародзіў яго ганаровай граматай і каштоўным падарункам.

Натхнёны ўвагай, ён вярнуўся ў Бабруйск працаваць з падвоенай сілай, энергіяй, любоўю!

Е. САДОЎСКІ.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ ДА ВЫДАТНАГА ЮБІЛЕЯ

Чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць уступіла ў паласу ўзмоцненай падрыхтоўкі да дзён слаўнага юбілея—XX гадавіны РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. Ствараюцца новыя калектывы, ансамблі, рыхтуюцца маладыя салісты з ліку байцоў, што нядаўна ўступілі ў рады РСЧА. Пішуцца частушкі. Развучваюцца байкі. Сыгрываюцца музыканты. Частушка, яшчэ нядаўна не знаходзіўшая поўнапраўнага грамадзянства ў праграмах самадзейнасці, цяпер стала любімым жанрам спевакоў, зацейнікаў, цэлых калектываў.

Дзесяткі рознастайных калектываў рыхтуюць новыя праграмы. Народныя песні і пляскі, мелодыі народаў СССР, героіка Чырвонай Арміі, песні совецкіх кампазітараў—вось рэпертуар самадзейнасці. І ў кожнай совецкай песні і частушцы—імя любімага народам і Чырвонай Арміяй правадыра народаў І. В. Сталіна, імёны яго слаўных саратнікаў. Баец Чырвонай Арміі, гатовы аддаць жыццё за правадыра рэвалюцыі, за справу партыі, любіць апяваць іх у сваіх песнях.

Лепшыя калектывы, якія вылучыліся сваёй высокай якасцю на асеннім акруговым праглядзе самадзейнасці і ў кампэрце чырвонаармейскай творчасці ў гонар першага маршала СССР таварыша Варашылава, значна ўзмацніліся, выраслі і якасна і колькасна. З захапленнем рыхтуюць яны новыя праграмы.

Ансамбль беларускай песні і пляскі Менскага ваеннага вучылішча рыхтуе мантаж народных беларускіх песень і танцаў. Мантаж тэатралізуецца. Ён адлюструе шчаслівае жыццё беларускай калгаснай вёскі.

Аркестр гарманістаў-кавалерыстаў у складзе 150 чалавек рыхтуе цыкл песень і маршаў пра слаўны гераічны шлях Чырвонай Арміі. У склад аркестра ўведзена танцавальная група.

Жаночы хор Н-скай кавалерыйскай дывізіі рыхтуе цыкл песень і хораў на тэму «З магутнай Чырвонай Арміяй жыць весела і радасна».

Данскі казачы хор рыхтуе праграму з песень аб совецкім казацтве. Уступнай песняй будзе «Казачая дума пра Сталіна».

Калектыў баявой чырвонаармейскай частушкі артылерыйскай часці выканае новыя частушкі аб правадырах Чырвонай Арміі і калгасным жыцці.

Змешаны масавы хор кавалерыстаў працуе над цыклам песень пра Сталіна і Варашылава.

Удасканальваюць беларускія, рускія і украінскія танцы ўдзельнікі танцавальнага калектыва Н-скай кавалерыйскай дывізіі.

Дзесяткі салістаў—спевакоў, спявачак, баяністаў, балалаечнікаў, расказчыкаў, чытальнікаў рыхтуюць выступленні пра Чырвоную Армію і вялікую радзіму.

Чырвонаармейскія ансамблі, хоры, танцавальныя калектывы, струнныя аркестры, драмкалектывы, спаборнічаючы за якасць, узмоцнена рыхтуюцца да юбілея.

Абвешчаны конкурсы: на лепшую ротную самадзейнасць, на лепшае выкананне страявой песні падраздзяленнем, на лепшую чытку мастацкіх твораў пра Чырвоную Армію.

Чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць рыхтуе добрую сустрэчу слаўнаму юбілею магутнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

В.

Гастролі дзіцячага тэатра БССР

Дзяржаўны дзіцячы тэатр БССР рыхтуецца да паездкі на гастролі ў гарады БССР—Бабруйск, Гомель, Рэчыцу, Мозыр і Лепель.

На гастролях тэатр пакажа юнаму гледачу спектаклі «Наша зброя»—А. Крона (пастаноўка рэжысёра Палічынецкага), «Казка пра цара Салтана» па А. С. Пушкіну і інсцэніроўку «Як гартавалася сталь».

Прэм'еры калгасна-соўгасных тэатраў БССР

Калгасна-соўгасныя тэатры БССР працуюць над новымі пастаноўкамі

Барысаўскі тэатр рыхтуе спектакль «Расплата за маладосць» Кузьмы Чорнага.

Полацкі тэатр працуе над пастаноўкай п'есы Прута «Год дзевятнаццаты».

Рагачоўскі тэатр рыхтуе пастаноўку «Агні маяка» Карасёва.

Новыя пастаноўкі тэатраў БССР

Беларускі дзярждрамтэатр паказаў прэм'еру «Без віны вінаватыя» А. Н. Астроўскага ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Рахленка. Зараз тэатр рыхтуе прэм'еру «Неспакойная старасць» Рахманава ў пастаноўцы засл. арт. БССР Літвінава.

Рускі драматычны тэатр БССР у Магілеве паказвае пастаноўку «Неспакойная старасць» і працуе над інсцэніроўкай «Анна Карэніна» па Л. Н. Талстому.

Віцебскі Белдрамтэатр паказаў гледачу прэм'еру «Агні маяка» Карасёва і рыхтуе пастаноўку «Дзеці Ванюшына» Найдзёнава.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР даў прэм'еру «У нашы дні» Вашэнцава ў пастаноўцы артыстаў Моіна і Трэпеля. Зараз тэатр рыхтуе «Суламіф» у пастаноўцы Галаўчынера і «Агні маяка» ў пастаноўцы Моіна.

У саюзе мастакоў

Саюз мастакоў БССР падрыхтоўвае мастацкую выстаўку, прысвечаную 20-годдзю Чырвонай Арміі.

Выстаўка будзе адкрыта ў Доме мастака 15 лютага. На ёй будуць выстаўлены карціны беларускіх мастакоў: Манасзона — «Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск» і «Верхавы»; Ахрэмчыка — «Уваход Чырвонай Арміі ў Менск»; Гела — «Кавалерыйская атака», «Атака» і «Палонны Будзённага»; Шаўчэнка — «Чырвоны казак»; Дучыца — «Партызаны»; Пашкевіча — «1920 год на Беларусі»; Ціханозіча — «Орджанікідзе ў разведцы» і «Партрэт чырвонаармейца»; Заборава — «Чапаеў» і «Конны раз'езд»; Волкава В. В. — «Партызаны» і інш. Таксама будуць выстаўлены скульптурныя работы Глебава, Азгура, Бразэра.

Усяго будзе выстаўлена каля 70 работ.



НА ЗДЫМКУ: карціна маст. Манасзона «Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск».
Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.



Карціна мастака В. І. Сурыкава «Раніца стралецкай кары».
Рэпрадукцыя Саюзфото.

На пасяджэнні паэтычнай секцыі

19 студзеня адбылося чарговае пасяджэнне паэтычнай секцыі ССПБ. На гэтым пасяджэнні складзены план работы секцыі на тры месяцы. На чарзе—абмеркаванне новых твораў А. Куляшова, П. Глебкі, Э. Агняцвет, А. Жаўрука і інш. Да дваццацігоддзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота секцыя паэтаў рыхтуе гарадскі вечар. Пасяджэнні секцыі будуць праводзіцца тры разы ў месяц.

На секцыі паэтаў таксама абмеркаван план выдання твораў сусветных і рускіх класікаў у перакладзе на беларускую мову і зборнікаў паэтаў нацыянальных рэспублік.

Канчатковы пераклад на беларускую мову «Віцязя ў тыгравай скуры» Шота Руставелі даручан т.т. К. Крапіве, П. Глебку і М. Хведаровічу, «Еўгенія Онегіна» А. С. Пушкіна — П. Броўку і А. Куляшову, паэмы Н. А. Някрасава «Каму на Русі жыць добра» — А. Астрэйку і М. Калачынскаму, паэмы «С. М. Кіраў» М. Бажана — Э. Агняцвет.

Паэты абавязаліся ў гэтым годзе падрыхтаваць і выдаць на беларускай мове аднатомнікі А. С. Пушкіна, Т. Г. Шаўчэнка, М. Ю. Лермантава, зборнікі вершаў грузінскіх паэтаў, зборнікі Паўло Тычыны, Сулеймана Стальскага, Гасема Лахуці і інш.

І. К.

В. І. СУРЫКАЎ

(Да 90-годдзя з дня нараджэння)

Васілій Іванавіч Сурыкаў нарадзіўся ў гор. Краснаярску 24 студзеня 1848 года.

Бацька яго быў малазаможны казак. Продкі Сурыкавых, данскія казакі, прыйшлі разам з Ермаком заваёўваць Сібір і аселі на новых землях.

Здольнасці да рысавання выявіліся ў Васілія Іванавіча вельмі рана. Беднасць, якая асабліва моцна дала сябе адчуць пасля смерці бацькі, прымусіла яго кінуць пачатае навучанне і шукаць заработкаў на службе ў якой-небудзь канцылярыі. Заветнай марай было дабрацца да Пецярбурга і паступіць у Акадэмію мастацтваў. Дапамог выпадак—лёсам юнага мастака зацікавіўся мясцовы золатапрамысловец.

У 1875 годзе Васілій Іванавіч скончыў Акадэмію мастацтваў, атрымаў за конкурсную праграму на нуднейшую тэму з гісторыі царквы па заданню совета званне класнага мастака першай ступені. Звычайна гэта давала права на замежную камандзіроўку, але не зусім пачціва абыходжанне з прэзідэнтам Акадэміі мастацтваў князем Уладзімірам пазбавіла яго гэтай паездкі.

У Акадэміі таго часу панавала сухая «вывучка», якая давала вучням веданне рысунка, халодную тэхніку — і толькі. Адзіным жывым чалавекам быў малады прафесар—ад'юнкт П. П. Чысцякоў—настаўнік многіх выдатных рускіх мастакоў, у тым ліку і Сурыкава, якому ён шмат даў у сэнсе глыбокага разумення жывапісных задач.

Дапамогі ў развіцці разумення творчых задач ніхто з прафесароў таго часу яму, вядома, аказаць не мог, ды ён і не меў у тым патрэбы. Ён быў вельмі самабытны. Яму адкрываліся новыя гарызонты, якіх тады яшчэ ніхто не бачыў.

У Маскве тады рабіўся роспіс храма Спасіцеля. Удзел у гэтым роспісу даў Сурыкаву неабходныя грошы для самастойнай творчай работы.

На перасовачнай выстаўцы 1881 года з'явілася першая карціна Сурыкава «Раніца стралецкай кары». Яна мела поспех у публікі, на яе звярнула ўвагу крытыка, вядомы збіральнік П. М. Трацьякоў набыў яе для сваёй галерэі, але можна з усёй пераканаўчасцю сказаць, што поўную ацэнку гэта карціна, як і ўся творчасць Сурыкава, атрымала толькі ў нашы дні—з боку совецкай грамадскасці, совецкай крытыкі. Толькі цяпер, пасля Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі, у святле ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі нам стала ясна, да якой ступені гэта было вялікае новае слова ў галіне гістарычнага жывапісу, як багата ў ім было сапраўднай неўміручай праўды і як гэта новае слова блізка нам. Гістарычных карцін пісалася шмат і ў нас і за мяжой, але ні адзін мастак не гараў такой вялікай любоўю да свайго народа, не быў да такой ступені нацыянальным народным мастаком, як Сурыкаў. Ні адзін мастак не ўзняўся ў сваіх палотнах да стварэння сапраўднай трагедыі, дзе галоўнай дзеючай асобай з'яўляецца народ. «Раніца стралецкай кары»—у поўным сэнсе гэтага слова трагедыя. Сутыкнуліся дзве сілы, два пачаткі.

Гледзячы на карціну Сурыкава, мы ясна ўсведамляем, што гэта так і было, што такімі, а не іншымі былі людзі таго часу. Тут справа не толькі ў велічы таленту, дасканаласці тэхнікі,—само сабою зразумела, што гэта з'яўляецца абавязковай умовай,—але і ў асаблівасці метада работы, ва ўмовах жыцця, маленства і юнацтва мастака.

Сурыкаў ствараў свае карціны на аснове глыбокага ведання народнага жыцця, яго гісторыі, помнікаў яго культуры. Ён нічога не выдумляў. Кожны задуманы ім вобраз перш, чым ажыццявіць яго ў карціне, ён павінен быў знайсці ў жыцці. І ён умеў знаходзіць свае вобразы сярод жывых людзей, і, калі пісаў гэтых жывых людзей з натуры, умеў бачыць у іх свае вобразы.

Жыццё ў далёкай Сібіры ў тыя часы, калі там не было яшчэ чыгункі, шмат у чым захавала рысы жыцця старадаўняй Русі, захавала старадаўнія звычаі і нават тыпы. Сурыкаў успрыняў гэта ў годы свайго маленства і юнацтва, якія ён правёў у Краснаярску. Будучы ўжо спелым мастаком, ён неаднаразова ездзіў у Сібір, на радзіму шукаць патрэбныя яму тыпы.

Сурыкаў надаваў вялікае значэнне самай дасканалай распрацоўцы кампазіцыі. Ён з вялікай настойлівасцю працаваў над кампазіцыйным вырашэннем свайго замыслу, але гэта не фармальнае вырашэнне размеркавання масы. У яго кожная фігура служыць для высвятлення пэўнай думкі. Ва ўсіх надзвычайна складаных шматфігурных кампазіцыях, пры самым дасканалым вывучэнні нельга знайсці ў яго двух фігур, якія выражаюць адзін і той-жа душэўны рух, якія паўтараюць адзін і той-жа тып, альбо фігуры мала выразнай, скарыстанай толькі для фармальнага вырашэння кампазіцыі. Кожная фігура таму і існуе ў яго, што яна ўносіць нешта новае, неабходнае для паўнаты выяўлення задуманага зместу.

Сурыкаў у юнацкія годы прывык зарысоўваць з натуры ці з памяці кожны заўважаны ім цікавы рух, фігуру. З цягам часу ў яго назбіралася велізарная колькасць гэтых, часам вельмі беглых, але яму зразумелых зарысовак. Ён дасканала вывучаў рухі чалавечага цела, выразнасць жэста, міміку твару. Вось чаму показ самых напружаных страсцей здзіўляе ў яго сваёй праўдзівасцю і прастатой, адсутнасцю хоць-бы невялікага адцення ілжывага пафасу.

Умовы, у якіх Сурыкаў пісаў свае карціны, былі далёка не спрыяючыя. Яму прыходзілася працаваць у невялікім пакоі. Карціна магла змясціцца толькі па дыяганалі і святло магло падаць толькі на адну з яе частак. Можа быць, гэтым часткова і тлумачыцца некаторая чарната жывапісу першага твора.

У наступнай сваёй карціне «Меньшыкаў у Беразове» ён ужо пазбегнуў гэтага недахопу. За два годы работы ён дасягнуў велізарнага майстэрства ў жывапісу.

Незабыўныя вобразы Меньшыкава і яго дачок напісаны са здзіўляючай сілай і праўдзівасцю. Рассеянае святло зімовага дня, якое льецца праз замерзлае акенца, перададзена з вялікім майстэрствам.

Карціна гэта была для Сурыкава па сутнасці перадышкай перад яго капітальнай работай «Баярыня Марозава», задуманай ім яшчэ ў 1881 годзе. Сурыкаў выношваў яе каля сямі год. Карціна з'явілася на перасовачнай выстаўцы ў 1887 годзе і мела выключны поспех, хоць і выклікала напады з боку крытыкаў. «Баярыня Марозава» — трагедыя, авеяная лірыкай народнай рускай паэзіі. Не ведаючы гэтай паэзіі, наўрад ці можна поўнасцю зразумець незвычайна ярка выражаны рознастайны тыпаж карціны.

Пафас непераможнага пратэсту выяўлен у фігуры баярыні Марозавай. Яна з'яўляецца цэнтрам карціны, але дзеючай асобай у роўнай меры з'яўляецца і народ, пратэстуючы супроць гнёту, супроць надругання з яго веры.

У «Баярыні Марозавай» Сурыкаў стварыў непараўнаны ўзор шматфігурнай кампазіцыі. Найцяжэйшыя задачы ўзаемаадносін героя і натоўпу выражаны ім з велізарнейшай дасканаласцю. Фігура героя не зацямняе народ, а з'яўляецца дзейснай сілай, якая выяўляе яго.

У карціне каля пяцідзесяці фігур. Кожная—ярка выражаны індывідуальны тып. Кожная знаходзіцца ў руху, выяўляючы яе характар і асаблівае, толькі ёй уласцівае перажыванне. І ўсё гэта падпарадкавана адзінаму рытму, зліта ў непарушнае цэлае і прыведзена ў рух, перададзены са здзіўляючым майстэрствам.

Вялікай прастаты і вялікага майстэрства дасягнуў Сурыкаў у сваёй карціне «Баярыня Марозава».

Наступнай карцінай, якая была задумана Сурыкавым, з'яўляецца «Сцяпан Разін і персідская княжна». Катастрофа, якая разразілася ў асабістым жыцці мастака, — смерць жонкі, перарвала гэту работу. Мінула некалькі год, покуль Сурыкаў вярнуўся да творчай работы.

У 1890 годзе ён пачынае працаваць над карцінай «Узяцце снежнага гарадка». Тэма яе — старажытная казацкая гульня на масленіцу. У процівагу трагічным палотнам, яна з'яўляецца, бадай, адзіным яго творам на жыццёрадасны сюжэт. Але напісаная са звычайным для Сурыкава майстэрствам, яна ўсё-ж мала для яго тыповая.

Следам за ёй Сурыкаў пачаў працаваць над трэцяй сваёй капітальнай карцінай, якая з'явілася на перасовачнай выстаўцы 1895 года, — «Пакарэнне Сібіры».

Сурыкаў ніколі не быў ураўнаважаным, застыглым майстрам. Ён заўсёды шукаў усё новых і новых спосабаў выражэння сваіх ідэй, праўдзівай перадачы бачанага. Метад кампазіцыі карціны «Пакарэнне Сібіры» зусім іншы, чым у «Баярыні Марозавай». Асобныя людзі зліты ў адзіныя калектывы. На першы план высунута масавае дзеянне. Карціна дасягае свайго ўздзейнічання чыста жывапіснымі вартасцямі, праўдзівасцю і пераканаўчасцю паказу людзей, тым непараўнаным умельствам, з якім Сурыкаў умеў нават самое паветра зрабіць гістарычным.

У 1896—1897 годы Сурыкаў працуе над велізарнай карцінай «Пераход Суворава праз Альпы ў 1799 годзе». Зноў новая манера, новы кампазіцыйны падыход, новая перадача жывапіснай формы. Але асноўныя якасці Сурыкава, як найвялікшага майстра гістарычнай кампазіцыі, застаюцца тыя-ж. Яго пошукі новых шляхоў заўсёды накіраваны не ў бок фармалістычных утончанасцей, а ў бок перадачы рэальнай праўды.

Карціна паказвае сапраўды геройскі пераход праз непраходныя горы ў зімовы час. Здзіўляючае майстэрства, з якім Сурыкаў перадае рух фігуры салдата на першым плане, які ляціць у бяздонне, вызначае ўсю абстаноўку месца дзеяння.

Спакойная дзелавітасць адных, вясёлы смех другіх, больш маладых салдатаў, фігура Суворава на кані, які падбадзёрвае жартамі салдатаў, ствараюць уражанне несакрушальнай магутнасці гэтага патоку людзей.

Вера ў народ, вера ў яго перамогу робяць гэтую карціну блізкай нам і зразумелай.

Апошняе вялікае гістарычнае палатно Сурыкава — карціна «Сцяпан Разін». Яна з'явілася на перасовачнай выстаўцы 1907 года. Кампазіцыйна Сурыкаў звярнуўся ў ёй да прынцыпаў кампазіцыі «Баярыні Марозавай», да тыповай характарыстыкі кожнай асобнай фігуры.

Сурыкаў памёр 19 сакавіка 1916 года.

Было-б памылкай думаць, што Сурыкаў абмяжоўваўся толькі гістарычнымі сюжэтамі. Ён быў вялікі і вельмі самабытны майстар і партрэтнага жывапісу і жывапісу пейзажнага. Яго эцюды з натуры маслам і акварэллю ўзнімаюцца на велізарную вышыню жывапісных дасягненняў. Іх асаблівай, вылучаючай рысай з'яўляецца прастата, поўная адсутнасць надуманых жывапісных эфектаў. У галіне ілюстрацыі, бытавых накідаў, шаржа, карыкатуры, — усюды Сурыкаў заставаўся ўдумлівым мастаком, выключным, буйным майстрам. Але для нас, вядома, галоўнае значэнне маюць яго гістарычныя палотны. У іх ён узняўся да вышыні, якая дала яму права ў наш час, у час Сталінскай Канстытуцыі быць прызнаным вялікім народным мастаком вялікага рускага народа.

М. А. КЕРЗІН.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёну. Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 68. тэл. сакр. 25-394, рэдактара 20-831.

Друкарня газеты «Звязда». Уп. Галоўлітбела № 4098.